Прадстаўніцтва зарэгістраванага аб’яднання “Deutscher Volkshochschul-Verband e.V.”
(Федэратыўная Рэспубліка Германія) у Рэспубліцы Беларусь
Гродзенскае абласное грамадскае аб’яднанне маладых навукоўцаў “ВІТ”

В. Саяпін, А. Вашкевіч, І. Трусаў, А. Чарнякевіч

# “У ПОШУКАХ ГІСТОРЫІ”:
# ПАЎСЯДЗЁННАЕ ЖЫЦЦЁ САВЕЦКАГА ГРОДНА

**Дапаможнік**

Мінск-Гродна 2010

**Саяпін, В.** і інш.
**“**У пошуках гісторыі”: паўсядзённае жыццё савецкага Гродна: дапаможнік. – Мінск-Гродна, 2010. – 48 с.

Дапаможнік утрымлівае матэрыялы сумеснага асветніцкага праекта **“**У пошуках гісторыі: паўсядзённае жыццё савецкага Гродна” Прадстаўніцтва зарэгістраванага аб’яднання “Deutscher Volkshochschul-Verband e.V.” (Федэратыўная Рэспубліка Германія) у Рэспубліцы Беларусь і Гродзенскага абласнога грамадскага аб’яднання маладых навукоўцаў “ВІТ”. Праект з’яўляецца спробай інавацыйнага падыходу да адукацыі дарослых у галіне гісторыі, што базуецца на сумесным вывучэнні штодзённасці савецкага горада на прыкладзе Гродна групай удзельнікаў праекта сумесна з арганізатарамі і экспертамі.

© В. Саяпін, А. Вашкевіч, І. Трусаў, А. Чарнякевіч
© Прадстаўніцтва зарэгістраванага аб’яднання “Deutscher Volkshochschul-Verband e.V.” (Федэратыўная Рэспубліка Германія) у Рэспубліцы Беларусь
© Гродзенскае абласное грамадскае аб’яднанне маладых навукоўцаў “ВІТ”

Публікацыя, якую шаноўны чытач трымае ў руках, зяўляецца вынікам сумеснага асветніцкага праекта “У пошуках гісторыі: паўсядзённае жыццё савецкага Гродна” Прадстаўніцтва зарэгістраванага аб’яднання “Deutscher Volkshochschul-Verband e.V.” (Федэратыўная Рэспубліка Германія) у Рэспубліцы Беларусь і Гродзенскага абласнога грамадскага аб’яднання маладых навукоўцаў “ВІТ”.

Ініцыятары праекта звярнулі ўвагу на тое, што з гістарычнай памяці гарадзенцаў пачынае знікаць савецкі перыяд (1939-41, 1944-91). Гэта звязана як з тым, што практычна адсутнічаюць прафесійныя гістарычныя даследванні гэтага перыяда (гісторыя партыйных і прафсаюзных арганізацый, якім прысвечана безліч кандыдацкіх дысертацый, мала каму цікавая), так і з тым, што ў грамадска-палітычным дыскурсе савецкі перыяд успрымаецца альбо як “залаты час”, альбо, наадварот, як нешта выключна адмоўнае. Як след, застаюцца толькі міты, створаныя альбо пост-камуністычнай, альбо антыкамуністычнай прапагандай. Гэтыя міты паступова пачынаюць замяняць фрагменты ўласнай памяці жыхароў горада... Каб нейкім чынам паправіць сітуацыю і заахвоціць гарадзенцаў да вывучэння нядаўняй гісторыі горада, было вырашана прапанаваць ідэю інавацыйнага праекта аднаўлення асобных аспектаў гісторыі Гродна савецкага перыяда.

Праект спалучае распрацоўку спецыялістамі-гісторыкамі асобных тэм гісторыі савецкага горада, актуалізацыю і збор успамінаў гарадзенцаў, а таксама сродкаў мемаралізацыі гэтых успамін. Праект з’яўляецца спробай інавацыйнага падыходу да адукацыі дарослых у галіне гісторыі, што базуецца на сумесным вывучэнні штодзённасці савецкага горада на прыкладзе Гродна групай удзельнікаў праекта сумесна з арганізатарамі і экспертамі ў пэўных тэмах.

У межах праекта на працягу верасня – снежня 2010 г. прайшлі інтэрактыўныя сустрэчы ў выглядзе экскурсій, якія вярнулі нас у мінулае на некалькі дзесяцігоддзяў:

- Верасень 1939 года. Нараджэнне савецкага Гродна.
- Паміж ідэалогіяй і штодзённасцю: жыццё праз прызму савецкай ідэалогіі.
- Гродна за партай: савецкая культура і адукацыя.
- Новыя гарызонты: архітэктура Гродна савецкага часу.
- Людзі ў форме: соцыятапаграфія савецкага горада.
- Нефармальны Гродна: грамадства ў пошуку выбара.

Сустрэчы правялі гісторыкі, чыя імёны добра вядомы сярод аматараў гарадзенскай гісторыі – В. Саяпін, І. Трусаў, А. Вашкевіч і А. Чарнякевіч. Пад час інтэрактыўных сустрэч адбываліся дыскусіі, абмен меркаванямі і ўспамінамі паміж экспертамі і ўдзельнікамі сустрэч.

Выніковае мерапрыемства праекта - выстава “Паўстагоддзя савецкага Гродна вачыма аднаго гродзенца” - прысвечана нашаму гораду савецкай эпохі. Матэрыялы выставы сумесна сабраныя арганізатарамі і ўдзельнікамі праекта з асабістых архіваў і лагічна пабудаваны такім чынам, каб адлюстраваць жыццё гродзенца, які нарадзіўся на пачатку савецкай эпохі і чыё дзяцінства, маладосць і сталасць прайшлі ў савецкім Гродна.

Зварочваючыся да нашага зусім нядаўняга мінулага, мы спадзяемся разам са ўсімі зацікаўленнымі пабачыць той самы неўхвытны момант, калі штодзённае жыццё ператвараецца ў факт гісторыі. Гэта не толькі спроба замацаваць сувязь паміж рознымі пакаленнямі, але і крок насустрач Гродна, які збольшага існуе пакуль што адно ва ўспамінах.

Аснову гэтай публікацыі склалі матэрыялы, напрацаваныя пад час праекту. Яны арганізаваны насупным чынам:

- Уводзны у гісторыю савецкага Гродна.
- Парады для самастойнага ці сумеснага вывучэння Гродна савецкай эпохі ў выглядзе прапанаванай канцэпцыі інтэрактыўных сустрэч-экскурсій па шасці тэмах.
- Даведнік-пуцявод па найбольш важных для гісторыі савецкага Гродна вуліцах і будынках.

Аўтарамі тэкстаў з’яўляюцца В. Саяпін, І. Трусаў, А. Вашкевіч і А. Чарнякевіч. Перш за ўсё, аднак, хацелася б падзякаваць Віктару Юр’евічу Саяпіну, без дапамогі якога, напэўна, гэтая публікацыя б не паўстала.

Мы спадзяемся, што прапанаваныя матэрыялы будуць цікавыя як для гарадзенцаў, якія захочуць самастойна паўтарыць прапанаваны намі шлях па гісторыі савецкага Гродна, так і для даследчыкаў, краязнаўцаў і адукатараў з іншых мясцін нашай краіны і замежжа.

І ўсё ж такі гэтая публікацыя — усяго толькі пачатак вялікай працы, першая спроба ацаніць нашае агульнае «месца памяці», тую спадчыну, што дасталася сённяшнім гродзенцам і пра якую мы ўсе павінны дбаць, каб не страціць свайго аблічча. Таму галоўная мэта выдання — паспрыяць актыўнаму ўзаемадзеянню грамадства, дзяржаўных структураў, бізнесу ў напрамку рацыянальнага і максімальна эфектыўнага выкарыстання савецкай спадчыны ў далейшым гарманічным развіцці нашага Гродна.

## “У пошуках гісторыі“: паўсядзённае жыццё савецкага Гродна

Гэта быў час пасляваеннай адбудовы, час узнікнення новай ідэалагічнай сістэмы, якая пранікала ва ўсе сферы жыцця нашага горада.

Гэта быў час магутных ідэалагічных святкаванняў (100 год Леніну, 50 год СССР і БССР, 70 год Кастрычніцкай рэвалюцыі ды інш.), суцэльных чырвоных дзён календара і многага іншага, што назаўсёды сышло (ці амаль сышло) ў мінулае. Між тым гродзенцы працягвалі жыць сваім звычайным жыццём, любілі пасядзець у неіснуючых цяпер піўных і кавярнях і пасылалі сваім сваякам дзе-небудзь у Навасібірску купленыя на Грандзіцкім рынку польскія сумачкі, або іншыя вырабы замежнай лёгкай прамысловасці.

Савецкі Гродна – гэта час прынцыповых зменаў ня толькі ва ўнутраным аблічччы горада. Гэта час вялізарных прамысловых абшараў, пабудовы першых спальных раёнаў, час, калі горад фантастычна хуткімі тэмпамі павялічваўся ў памерах. У 1950-х – 1980-х гг. у горадзе паўсталі не толькі новыя будынкі тэатраў, кінатэатраў і ўладных установаў, якія павінны былі засведчыць перамогу новага ладу, але і мноства звычайных шэрых шматпавярховікаў, якія далі прытулак усім тым, хто перабіраўся з вёскі ў горад, да больш заможнага і свабоднага жыцця.

Гродна быў не проста ідэалагічнай вітрынай Савецкага Саюза. Наш горад, як і ўся Беларусь, быў часткай вайсковага ўдарнага кулака краіны саветаў, накіраванага супраць НАТО. Танкісты, пяхота, артылерыя, сувязь, пагранічнікі – увесь горад быў напоўнены войскам у большай нават ступені, чым у часы Расійскай імперыі ці міжваеннай Польшчы.

У форме ў Гродна 1950-1960-х гг. хадзілі вайскоўцы, міліцыянеры, супрацоўнікі КДБ, пажарныя, супрацоўнікі юстыцыі і чыгуначнік, навучэнцы сярэдніх навучальных установаў (тады ФЗУшніку можна было пры пэўнай снароўцы сайсці за будучага лётчыка). Салдаты, прадстаўнікі ўсіх нацыянальнасцей СССР, надавалі гораду непаўторнае аблічча і шмат хто заставаўся тут і пасля службы. Адсюль жа многія жыхары Савецкага Саюза накіроўваліся на службу ў Чэхаславакію ці ГДР. Горад таксама доўга памятаў і аб трагедыях, якія адбываліся па віне вайскоўцаў, напрыклад гібель некалькіх студэнтаў Гродзенскага сяльгасінстытута пад гусеніцамі танка ў 1964 годзе.

Аднак, нягледзячы на тое, што Гродна 1970-80-х гг., як любы савецкі горад, поўніўся партрэтамі правадыроў і заходзіўся ад чырвані сцягоў на вялікія савецкія святы, у ім заўсёды існавала магутная плынь нефармальнага жыцця. Магчыма таму, савецкі Гродна - адзін з важных асяродкаў руху хіпі, месца ўзнікнення рокавых і не толькі гуртоў і іншых андэграўдных плыняў, месца натхнення і працы беларускіх пісьменніках з пакалення шасцідзесятнікаў.

І ўсё гэта – наша гісторыя...

## “Як вывучаць гісторыю савецкага Гродна?”
## (некалькі парад аматарам гісторыі)

На жаль, з вялікім спазненнем, паволі да нас прыходзіць разуменне, што Гродна — гэта не толькі храмы і замкі, але і шараговыя камяніцы, дзе, магчыма, жылі зусім звычайныя людзі, а часамі адзінае, што нас усіх аб'ядноўвае — гэта ўласна тыя вуліцы Гродна, на якіх мы раз-пораз сустракаемся...

Гарадскія вуліцы — гэта найперш будынкі, якія гэтыя вуліцы і фармуюць. У гэтай публікацыі мы паспрабавалі згадаць усе больш-меньш цікавыя гістарычныя пабудовы Гродна звязаныя з савецкім перыядам. А распавесці ёсць пра што, бо шмат якія з гродзенскіх камяніцаў пабачылі лёсавызначальныя падзеі найноўшай беларускай гісторыі, іншыя самі з'яўляюцца непадзельнай часткай сучаснага гарадскога ландшаўта.

Кожны з нас, так ці інакш, звязаны з савецкім мінулым. На жаль, не заўсёды мы маем дакладныя дадзеныя пра тыя установы, інстытуты, крамы, што знаходзіліся ў горадзе ў савецкі час. Улічваючы, што гэта толькі першы досвед сістыматызацыі нашых ведаў, аўтары палічылі магчымым абмежавацца толькі той інфарамацыяй, якая будзе ў першую чаргу карыснай дзеля самастойнай ці сумеснай працы па вывучэнні і папулярызацыі ведаў па гісторыі савецкага часу.

Для аматараў гісторыі аўтары прапануюць даведнік-пуцявод па вуліцах і будынках савецкага Гродна. Гістарычныя звесткі пададзены ў даведніку ў альфабетычным парадку згодна з сённяшнімі назвамі вуліц і сучаснай нумарацыяй будынкаў на іх. Карыстальнік дапаможніка можа сам свабодна спалучаць атрыманыя веды і тым самым значна пашыраць успрыманне эпохі.

У сваю чаргу, падсумовываючы ўжо атрыманы досвед, аўтары прапануюць да ўвагі чытачоў апісанне шасці праведзеных у межах праекта інтэрактыўных сустрэч-экскурсій.

Апісанне кожнай сустрэчы-экскурсіі ўтрымлівае назву, мэту, прапануемы маршрут, уводны матэрыял, праграму і парады па правядзенні сустрэчы.

Уводны матэрыял даецца ўсім удзельнікам перад пачаткам сустрэчы, каб яны валодалі пэўнай схемай – чым яны будуць займацца гэты раз і адпаведна маглі падрыхтавацца.

Звесткі па змястоўным напаўненні кожнага маршрута трэба браць з раздзела *Даведнік-пуцявод па вуліцах і будынках савецкага Гродна*.

**Сустрэча 1. Верасень 1939 года. Нараджэнне савецкага Гродна.**

**Мэта:** Азнаямленне з падзеямі 1939 г. Уваходжанне ў ролю абаронцы або вызваліцеля Гродна.

*1-ы маршрут: вул. Маставая – вул. Антонава (Каталіцкія могілкі) – вул. Белуша (Вайсковыя могілкі) – вул. Леніна – вул. Ажэшкі*
*2-гі маршрут: вул. Гарнавых – Савецкая плошча – вул. Савецкая – вул. Ажэшкі*

**Уводны матэрыял**

У верасні 1939 года наш горад выразна падзяліўся. Частка гродзенцаў гераічна абараняла свой горад ад "чырвоных захопнікаў", другая частка дапамагала Чырвонай арміі. Гэтыя падзеі і гэтае супрацьстаянне было вынікам усіх тых супярэчнасцей, якія накапліваліся ў жыцці горада цягам папярэдніх дзесяцігоддзяў. Нам жа, аднак, трэба ўспомніць пра падзеі верасня 1939 года, успомніць не на аснове гераічных тэкстаў, а грунтучыся на ўспамінах сведак і сучаснікаў, каб уявіць сабе тыя дні без прыкрысы і ідэалагічнай заангажаванасці.

**Праграма і парады па правядзенні сустрэчы**

Удзельнікам сустрэчы прапануюць падзяліцца на дзве групы. Адна пойдзе па шляху абаронцаў Гродна ў 1939 г., другая па шляху вызваліцеляў – Чырвонай Арміі і прыхільных да яе гродзенцаў. Групы ідуць па розных знакавых для адных і для другіх "сімвалічных" маршрутах і сустракаюцца ў месцы, якое мае важнае значэнне для абодвух варыянтаў гістарычнай памяці. Паколькі сярод удзельнікаў сустрэчы няма сведкаў 1939 г., то галоўная арыентацыя робіцца на ўспаміны сваякоў удзельнікаў сустрэчы, якімі тыя, папяэдне падрыхтаваўшыся, дзеляцца з іншымі.

**Сустрэча 2. Паміж ідэалогіяй і штодзённасцю: жыццё праз прызму савецкай ідэалогіі.**

**Мэта:** Вывучэнне ўплыву (або неўплыву) ідэалогіі на штодзённае жыццё савецкага Гродна.

*Маршрут: Савецкая плошча – вул. Савецкая – вул. Ажэшкі – плошча Леніна – плошча Тызенгаўза*

**Уводны матэрыял**

Гэтым разам усе жадаючыя змогуць даведацца аб штодзённым жыцці гродзенцаў 1940-1970-х гг. Гэта быў час пасляваеннай адбудовы, час узнікнення новай ідэалагічнай сістэмы, якая пранікала ва ўсе сферы жыцця нашага горада і выражалася не толькі ў помніках Леніну, Сталіну, якіх багата было на нашых вуліцах.

Гэта быў час магутных ідэалагічных святкаванняў (100 год Леніну, 50 год СССР і БССР і інш.), суцэльных чырвоных дзён календара і многага іншага, што назаўсёды сышло (ці амаль сышло) ў мінулае. Між тым гродзенцы працягвалі жыць сваім звычайным жыццём, любілі пасядзець у неіснуючых цяпер піўных і кавярнях і пасылалі сваім сваякам дзе-небудзь у Навасібірску купленыя на Грандзіцкім рынку польскія сумачкі, або іншыя вырабы замежнай лёгкай прамысловасці.

**Праграма і парады па правядзенні сустрэчы**

Удзельнікі сустрэчы рухаюцца па загадзя вызначаным маршруце, прысвечаным як ідэалагічным установам, так і гродзенскай штодзённасці. Сустрэча будуецца па наступным плане – эксперт паведамляе аб важных ідэалагічных установах (калі будаваліся савецкія адміністрацыйныя будынкі і інш.), а ўдзельнікі згадваюць свой удзел у тагачаснай савецкай штодзённасці. Напрыканцы сустрэчы стараюцца параўнаць штодзённую рэчаіснасць і прапаганду.

**Сустрэча 3. Гродна за партай: савецкая культура і адукацыя.**

**Мэта:** Азнаямленне з культурнай палітыкай савецкай улады, асноўнымі ўстановамі адукацыі

*Маршрут: вул. Сацыялістычная – вул. Савецкая – вул. Дзяржынскага – вул. Горкага*

**Уводны матэрыял**

Сістэма адукацыі выконвала важную ролю ў выхаванні чалавека новай эпохі – савецкага грамадзяніна. Зрабіць такога чалавека з простага гродзенца было не так-та і проста, аднак у савецкі час горад наш выпрацаваў значныя педагагічныя традыцыі, праславіўся многімі разумнымі і свабодалюбівымі выкладчыкамі. Чарговая сустрэча праекта "Савецкі Гродна: у пошуках штодзённасці" прысвечана савецкім адукацыйным установам – школам і інстытутам.

**Праграма і парады па правядзенні сустрэчы**

Кожны гродзенец, старэйшы за 26 гадоў, прайшоў праз савецкую адукацыйную сістэму. Пад час гэтай сустрэчы галоўная ўвага аддаецца меркаванням удзельнікам. Яны дзеляцца сваімі згадкамі пра розныя адукацыйныя ўстановы Гродна (вядучы фактычна толькі падводзіць удзельнікаў да гэтых установаў, дае агульныя ўводныя). Напрыканцы вырашаецца галоўнае пытанне – чаго больш было ў адукацыі ў савецкі час – рэальнага навучання або ідэалогіі.

**Сустрэча 4. Новыя гарызонты: архітэктура Гродна савецкага часу.**

**Мэта:** Вывучэнне ўплыву савецкай архітэктуры на развіццё горада і свядомасць гараджан.

*Маршрут: вул. Горкага (ад рынка "Карона" да плошчы Тызенгаўза)*

**Уводны матэрыял**

Савецкі Гродна – гэта час прынцыповых зменаў ня толькі ва ўнутраным абліччы горада. Гэта час вялізарных прамысловых абшараў, пабудовы першых спальных раёнаў, час, калі горад фантастычна хуткімі тэмпамі павялічваўся ў памерах. У 1950-х – 1980-х гг. у горадзе паўсталі не толькі новыя будынкі тэатраў, кінатэатраў і ўладных установаў, якія павінны былі засведчыць перамогу новага ладу, але і мноства звычайных шэрых шматпавярховікаў, якія далі прытулак усім тым, хто перабіраўся з вёскі ў горад, да больш заможнага і свабоднага жыцця. Наступная сустрэча праекта "Савецкі Гродна: у пошуках штодзённасці" прысвечана толькі адной вуліцы Гродна – вуліцы Горкага, даваеннай яшчэ Грандзіцкай, у якой лёсы ўсяго нашага горада пасляваеннага часу адбіліся вельмі выдатна. Пройдзем яе ўсю, пазнаёмімся з яе архітэктурай, прамысловымі прадпрыемствамі, установамі і помнікамі, параўнаем даваенную і пасляваенную часткі.

**Праграма і парады па правядзенні сустрэчы**

Удзельнікі ідуць вуліцай Горкага. Згадваюць сваю працу на прамысловых прадпрыемствах гэтай вуліцы. Абмяркоўваюць, як будаўніцтва змяніла сацыяльнае аблічча Гродна. Каля тэлерадыёцэнтра згадваюць аб ролі тэлебачання і радыё ў жыцці савецкага Гродна. Важна таксама абмеркаваць гісторыю адсоўвання мяжы Гродна, бо пашырэнне горада ў савецкі час асабліва добра відаць па вуліцы Горкага.

**Сустрэча 5. Людзі ў форме: соцыятапаграфія савецкага горада.**

**Мэта:** Вывучэнне разнастайных савецкіх устаноў, іх ролі ў жыцці горада.

*Маршрут: вул. Замкавая – вул. Горкага – вул. Дзяржынскага*

**Уводны матэрыял**

Гродна быў не проста ідэалагічнай вітрынай Савецкага Саюза. Наш горад, як і ўся Беларусь, быў часткай вайсковага ўдарнага кулака краіны саветаў, накіраванага супраць НАТО. Танкісты, пяхота, артылерыя, сувязь, пагранічнікі – увесь горад быў напоўнены войскам у большай нават ступені, чым у часы Расійскай імперыі ці міжваеннай Польшчы.
Салдаты, прадстаўнікі ўсіх нацыянальнасцей СССР, надавалі гораду непаўторнае аблічча і шмат хто заставаўся тут і пасля службы. Адсюль жа многія жыхары Савецкага Саюза накіроўваліся на службу ў Чэхаславакію ці ГДР. Горад таксама доўга памятаў і аб трагедыях, якія адбываліся па віне вайскоўцаў, напрыклад гібель некалькіх студэнтаў Гродзенскага сяльгасінстытута пад гусеніцамі танка ў 1964 годзе.
Але ў форме ў Гродне 1950-60-х гг. хадзілі не толькі вайскоўцы. Міліцыянеры, супрацоўнікі КДБ, пажарныя, супрацоўнікі юстыцыі і чыгуначнікі. Навучэнцы сярэдніх навучальных устаноў таксама хадзілі ў форме (тады ФЗУшніку можна было пры пэўнай снароўцы сайсці за будучага лётчыка).
Цікавую супольнасць людзей у форме ў нашым горадзе складалі мытнікі.

**Праграма і парады па правядзенні сустрэчы**

Удзельнікі сустрэчы ідуць па вызначанаму экспертам маршруту, звязанаму з мясцінамі, дзе знаходзіліся важныя ўстановы, у якіх людзі насілі форму. Паколькі ў той час форму насілі амаль усе – пачынаючы ад школьнікаў да супрацоўнікаў сілавых структураў, то ўдзельнікі сустрэчы лёгка дапаўняюць эксперта сваімі ўспамінамі. Напрыканцы сустрэчы ладзіцца перфоманс. Адзін з удзельнікаў сустрэчы, перапрануты ў форму (у нашым выпадку гэта была форма беларускага мытніка), прапаноўвае ўдзельнікам сустрэчы выканаць нейкую характэрную чыннасць (напрыклад, раздае для запаўнення мытныя дэкларацыі).

**Сустрэча 6. Нефармальны Гродна: грамадства ў пошуку выбара.**

**Мэта:** Азнаямленне з гісторыяй "падземнага Гродна", нефармальнага боку жыцця савецкага горада.

*Маршрут: вул. Ажэшкі (ад помніка Элізы Ажэшкі) – вул. Леніна – вул. Тэльмана - вул. Савецкая*

**Уводны матэрыял**

Нягледзячы на тое, што Гродна 1970-80-х гг., як любы савецкі горад, поўніўся партрэтамі правадыроў і заходзіўся ад чырвані сцягоў на вялікія савецкія святы, у ім заўсёды існавала магутная плынь нефармальнага жыцця. Гэта было выклікана ці тое блізкасцю Польшчы, хаця і падсавецкай, але нашмат больш дэмакратычнай, ці тое самой атмасферай свабодалюбівага горада над Нёманам. Адзін з важных асяродкаў руху хіпі, месца ўзнікнення рокавых (і не толькі) гуртоў і іншых андэграўдных плыняў, месца натхнення і працы беларускіх пісьменнікаў з пакалення шасцідзесятнікаў…

**Праграма і парады па правядзенні сустрэчы**

Эксперт паказвае ўдзельнікам сустрэчы найбольш знакавыя мясціны нефармальнага Гродна савецкага часу. Гэта месцы тусовак, кватэры найбольш знакамітых музыкаў, мастакоў і інш. Канешне, кожны з удзельнікаў хоць у нейкай ступені меў дачыненне да нефармальнага Гродна, аб чым згадвае для астатніх. Гэта можа быць успамін нават пра набыццё дарагой пласцінкі "Бітлоў" або выступ універсітэцкага начальніка, які забараняў студэнтам звязвацца з "хіпанамі" і насіць даўгаватыя валасы і раскляшоныя нагавіцы.

# Даведнік-пуцявод па вуліцах і будынках савецкага Гродна

## А

### Ажэшкі

**Ажэшкі № 1 — Палац князёў Масальскіх.** Пабудаваны каля 1795 г.

У 1947 г. у будынку размяшчаўся чыгуначны тэхнікум. У 1950 г. – трохгадовая школа машыністаў ды чыгуначная санэпідстанцыя. Галоўны корпус і рэктарат медінстытута. У 1956 г. у паўпадвальным паверсе была адчынена спецыялізаваная крама па продажу мясных і каўбасных вырабаў. У памяшканні цяперашняй "Чебуречной" размяшчалася чыгуначная аптэка.

**Ажэшкі № 2/4 — Банк.** Узведзены каля 1934 г.

На кастрычнік 1944 г. – Камунальны банк, гродзенская цэнтральная ашчадная каса № 6416. Падвал і склад пры будынку былі перададзены Аптэкаўпраўленню. У 1945 г. – тут працавалі крамы №№ 13 і 14 "Горпищепромторга". У верасні 1964 г. адчынілася крама "Мелодия" па продажу музычных інструментаў і тэлерадыёапаратуры. У 1960-70-я гг. – крама "Мелодия" і прадуктовая крама. З чэрвеня 1965 г. – крама "Алеся".

**Ажэшкі № 3 — выканкам абласнога Савета народных дэпутатаў, Гродзенскі аблвыканкам.** Уключае былы дом віцэ-губернатара і дзевяціпавярховы будынак, які з'яўляецца прыкладам адміністрацыйных збудаванняў савецкай архітэктуры (год пабудовы — 1966, архіт. І. Міхед; рэканструкцыя — 1979 г.: архітэктары І. Еўдакімаў, У. Праабражэнскі, М. Бярэзін). У 1970 г. у памяць аб дзейнасці рэўкома і знаходжанні Ф. Дзяржынскага на доме віцэ-губернатара усталяваны мемарыяльныя дошкі.

Пасаду старшыні Гродзенскага аблвыканкама ў розныя гады займалі — П. Ратайка (1944-1948), Ф. Ляхаў (1945-1951), І. Кананові (1951-1961), Н. Малочка (1961-1972), Г. Фамічоў (1972-1978), С. Кабяк (1978-1983), Д. Арцыменя (1983-1993), С. Домаш (1993-1994), А. Дубко (1994-2001), У. Саўчанка (2001 - 2010), С. Шапіра (з 2010).

**Ажэшкі № 6 — Дом Шеваха Катоўскага**. Пабудаваны ў 1924 г.

У 1961 г. у будынку знаходзілася крама № 42 "Подарки" Гродзенскага гарпрамгандлю.

**Ажэшкі № 8 — Дом Роттертаў, дом Урублеўскай**. Год пабудовы - 1894.

У 1951 г. тут адчынілася фірменная крама "Главэлектросвязьсбыт". Тут у продажы меліся радыёпрыёмнікі і радыёлы, радыялампы, грампласцінкі, гучнагаварыцелі, электраасвяціцелі ды аўтамабільныя лампы, электраплiткі і прасы. У 1960 г. у гэтым жа памяшканні была адчынена крама № 3 "Электрооборудование". У 1970 г. – крама № 3 "Огонек" па продажу электратавараў. З 1984 г. у ім адчынены магазін «Часы». У энцыклапедычным даведніку «Гродна» за 1989 г. адзначалася, што магазін дадаткова «прымае замовы на часова адсутныя тавары, прадае тавары ў крэдыт, прымацоўвае раменьчыкі ды бранзалеты да гадзіннікаў».

**Ажэшкі № 8а** — Год пабудовы — 1924. У 1950 г. у доме № 8а знаходзіўся гродзенскі рыбтрэст.

Скрыжаванне сучасных вуліц Ажэшкі і Сацыялістычнай цягам апошніх дзесяцігоддзяў вельмі моцна змяніла свой знешні выгляд. У 1955 г. у доме № 12 знаходзілася механічная майстэрня арцелі "Прогресс" па рамонту металічнага посуда, прымусаў, керасінавых лампаў, керагазаў. У доме № 14 (пазней ён стаў № 16) знаходзілася партрэтная майстэрня і фотаатэлье № 6 Горбыткамбіната. У 1956 г. адчынілася майстэрня арцелі "Прогресс" па рамонту кожгалантырэйных вырабаў.

30 верасня 1958 г. Гарвыканкам прыняў рашэнне пра знос жылых дамоў №№12, 12а, 14а і 14б пад будоўлю чатырохпавярховага жылога дома. Пры гэтым дом № 10 па

вул. Ажэшкі - дом сям'і Урублеўскіх, згодна рашенню Гарвыканкама ад 14 студзеня 1959 г. быў перанесены на вул. Маякоўскага ( зусім верагодна, што ён захаваўся там да гэтага часу ).

Пасля будоўлі чатарохпавярховага дома, на ягоным першым паверсе размесціліся майстэрні па рамонту радыяапаратуры, музычных інструментаў, гадзіннікаў, а так сама цырульня ды фотаатэлье № 1.

Побач у 1960 г. было пабудавана "Кафе-мороженое", больш вядомае ў горадзе як г.зв. "Телевизор". Яго разам з атэлье знеслі ў маі 1966 г.. Летам 1968 г. на гэтым месцы ў быў разбіт невялікі сквер "…в честь 50-летия Белорусской республики и Компартии Белоруссии" у выглядзе тэрасаў, якія спускаліся ў бок р. Гараднічанкі.

На супрацьлеглым баку, на месцы клумбы каля кінатэатра, так сама быў дом. З канца 1940-х тут працавала піўная, затым з 1959 г. ў краме № 40 былі ўсталяваны аўтаматы па продажу газаванай вады, піва ды віна ( ад чаго ўстанова атрымала сярод насельніцтва назву "Автопоилка" ). Пасля ліквідацыі крамы "Пиво-воды-соки" ў красавіку 1968 г. тут была адчынена фірменная крама "Табак" гродзенскай тытунёвай фабрыкі. Пад гэтай назваю – "Табак", дом і захаваўся ва ўспамінах мясцовых жыхароў. Знесены ў сярэдзіне 1970-х.

На самім скрыжаванні, падчас баёў 20 верасня 1939 г. быў падбіты адзін з савецкіх танкаў, а ўся ягоная каманда — загінула.

**Ажэшкі № 9 — Бровар баніфратраў, дом І. Фрумкіна, акружная лячэбніца, упраўленне гродзенскай паштова-тэлеграфнай акругі, паштова-тэлеграфная кантора, акружны суд, камера пракурора, камера таварышча пракурора, камера старэйшага натарыўса ( на 1894 г. ), акружная ўправа, "Главпочтамт".** Год пабудовы— 1795. Капрамонт — 1944 г.

У 1946 г быў падрыхтаваны наступны праект рэстаўрацыі будынка Паштамта: "…Фасад большого двухэтажного здания украшают три симметрично расположенных портала с четырьмя пилястрами каждый. Центральный портал будет увенчан гранитным барельефом герба Белорусской республики. Под ним – красивые часы. Массивная стеклянная дверь ведет в вестибюль, в центре которого будет установлена скульптура товарища Сталина. Вдоль стен, по обеим сторонам вестибюля, устанавливаются абонентские ящики. Красиво и величественно будет выглядеть просторный операционный зал. Пять массивных колонн, пересекающих центр этого зала, будут держать на себе громадный, площадью свыше трехсот квадратных метров, плафон… На втором этаже почтамта разместятся областное управление связи, бюро контроля почтовых переводов, "Союзпечать", клуб работников связи с большим зрительным залом".

**Ажэшкі № 11 — Дом Фрумікна, Аптэка.** Год пабудовы — 1910. Па стану на 1950 г. – "Областное аптекоуправление" ды аптэка № 1.

**Помнік Элізы Ажэшкі** — Скульптурны партрэт Э. Ажэшкі працы скульптара Р. Зерыха. Першапачаткова пастаўлены ў 1929 г. у гарадскім парку. У Вялікую Айчынную вайну жыхары горада зберaглі бюст Э. Ажэшкі, схаваўшы яго на каталіцкіх могілках ( па іншых дадзеных, на могілкі помнік трапіў згодна загаду нямецкіх уладаў ). Рашэннем гарадскога Савета скульптура была ўстаноўлена ў ліпені 1947 года. Была пастаўлена на новым месцы гарадскім архітэктарам Кліменкам, які асабіста прасачыў, каб помнік адпавядаў разбуранаму арыгіналу.

**Ажэшкі № 17 — Дом Элізы Ажэшкі.** Пабудаваны ў 1976 г. ( архітэктар-рэстаўратар В. Кунін ) з пераносам у глыб вуліцы, як копія драўлянага дома, у якім жыла польская пісьменніца Эліза Ажэшка.

У 1945 г. тут працавала гродзенская абласная праектная кантора "Облпроект" і станцыя па пераліванні крыві. У 1953 г. на доме ўсталявана мемарыяльная дошка ў гонар Э. Ажэшкі. У 1960-я г.г. тут працавала гродзенскае аддзяленне Саюза пісьменнікаў БССР, якое пэўны час узначальваў А. Карпюк.

**Ажэшкі № 19 — Дом Абрэмбскага.** Пабудаваны ў канцы XIX ст.

У стедзені 1945 г. ў будынку адчыніліся курсы па падрыхтоўцы настаўнікаў для абласных пачатковых школ ды фельчарска-акушэрская школа. У 1950 г. – гарадскі

аўтамотаклуб, 1957 г. – школа № 5. У 1964 г. — станцыя юных тэхнікаў, а з 1969 г. — інстытут павышэння кваліфікацыі настаўнікаў.

**Барэльеф «Навука»** - Аўтар Г. Буралкін. Адчынены ў 1975 г. на сцяне дома па вул. Ажэшкі № 19. Выяўляе алегарычны вобраз навукі ў выглядзі жанчыны з кнігай – сімвалам веды, і яе прадстаўнікоў у мінулым, сучасным і будучыні. Ствараў агульную кампазіцыю з універсітэтам праз дарогу і быў свайго кшталту выклікам праваслаўнай царкве насупраць.

У снежні 1959 г. да тарцовая сцяны будынка з боку вул. Леніна была прыбудавана "Кафе-мороженое" на 40 месцаў, якое хутка атрымала сярод жыхароў назву "Стекляшка" і сталася любімым месцам адпачынку студэнтаў з мясцовага педінстытута. Знесена ў ліпені 1974 г.

**Ажэшкі № 20 — Палац князеў Чацвярцінскіх.** Год пабудовы — 1786. З савецкіх часоў выкарыстоўваецца пад розныя вайсковыя ўстановы: з 1945 г. і па сёняшні дзён будынак займае вайсковая камендатура. Акрамя таго, тут працавалі 1-ы і 2-гі вучастак нарсуда Гродна.

**Ажэшкі № 22 — Гродзенскі дзяржаўны універсітэт імя Я. Купалы.** Пабудаваны ў 1893 г. з цэглы, у 1969 г. да трохпавярховага корпуса прыбудаваны чатырохпавярховы.

**а)** Год пабудовы— 1893. Аўтар праекта — інж. Небальсін. У 1940-1941 гг. дзейнічаў настаўніцкі інстытут ( меў тры аддзяленні і рыхтаваў настаўнікаў для пятых—сёмых класаў няпоўных сярэдніх школаў ), на базе якога ў 1944 г. быў створаны педінстытут. Інстытут меў чатыры факультэты. З 1978 г. — педагагічны універсітэт.

Перад будынкам універсітэта ў 1964 г. пастаўлены бронзавы бюст Янкі Купалы скульптара З. Азгура. На пастаменце прыведзены ўрывак з купалаўскага верша:

*Мілая моладзь, слаўная моладзь,*
*Нашай бязмежнай краіны!*
*Горы і моры можаш ты здолець,*
*Сэрцам расплавіць ільдзіны..."*

Гэта не адзіны помнік, што стаяў каля будынка былой гімназіі. Пасля ўсталявання савецкай улады ў 1939 г. злева ад параднага ўвахода ў настаўніцкі інстытут з'явілася трохметровая выява Сталіна, якую ў чэрвені 1941 г. мясцовыя жыхары скінулі з пастамента.

**б)** У снежні 1959 г. Гарвыканкам прыняў рашенне пра пашырэнне корпуса інстытута за кошт пабудовы 4-х павярховага корпуса з галоўным увaходам і будынкам сталоўкі па праекце І. Мазнічка ( 1-я чарга ) ды трохпавярховай "перамычкі" паміж карпусамі (2-я чарга ). Другая частка педінстытута была прынята дзяржаўнаю камісіяй 28 верасня 1964 г.

**Ажэшкі № 23 — Свята-Пакроўскі сабор.** Пабудаваны ў 1907 г.

У верасні 1939 г. у царкве забарыкадзіравалася частка палітвязняў, збеглых з гродзенскай турмы (згодна іншай версіі - у саборы хаваліся ўгалоўнікі, што вырваліся разам з палітвязнямі з-за крат).

З чарговым усталяваннем савецкай улады ў 1944 г. савецкімі органамі былі арыштаваныя амаль усе пастыры Пакроўскага сабора: настаяцель Фёдар (Валікоўскі), пратадз'якан Філіп (Рубан), рэгент-святар Фёдар (Выбарнаў). У 1962 г. быў забаронены саборны звон (замест штодзенных службаў яны праводзіліся толькі тры разы на тыдзень).

**Ажэшкі № 28 — Дом Хаіма Рама.** Год пабудовы — 1874.

У 1980-я гады ў магазіне на рагу вуліц Ажэшкі і Акадэмічнай прадавалася гародніна. Зараз будынак перададзены праваслаўнай епархіі.

**Ажэшкі № 29 — Дом Гурэвіча**. Год пабудовы — 1898. На першым паверсе будынка на пачатак 1950-х г. працавала хлебапякарня "ОРС НОД-4". На першым паверсе тады ж адчынілася фотаатэлье № 8.

**Ажэшкі № 30 / Акадэмічная № 1 — Dom strzelćow.** Год пабудовы — каля 1936.

У верасні 1939 г. тут абараняліся вучні польскіх гімназіяў, некаторыя з якіх пазней былі расстраляны савецкімі ўладамі на г.зв. "Сабачай горцы".

**Ажэшкі № 34 — Дом Рефеса**. Пабудаваны ў пачатку XX ст..

На верасень 1944 г. – Упраўленне Наркамюста па Гродзенскай вобласці і гарадскі суд. У 1947 г. - крама “Главособунивермаг” Міністэрства гандлю БССР. На 1950 г. – універмаг, абласная пракуратура. У 1954 г. – “Горпищепромторг”. У 1960 г. – крама “Оптика” гродзенскага абласнога апптэкаўпраўлення.

**Ажэшкі № 35 — Дом Эйсманта**. Пабудаваны ў пачатку XX ст.

У верасні 1944 г. другі паверх будынка быў перададзены пад абласны суд, тады як на першым паверсе знаходзілася майстэрня па вырабу... ляляк. Майстэрню, аднак, у хуткім часе перанеслі на Скідзельскі рынак, а ў вызваліўшымся памяшканні размясцілася кантора адваката. Рашеннем выканкама Горсавета ад 13 мая 1947 г. памяшканне цырульні было перададзена Гродзенскаму аэрапарту пад “Агентство Гражданского воздушного флота СССР”. У 1950 г. – гарадская пракуратура. З 1960 г. па канец 1980-х гадоў тут працавала вядомая ў горадзе крама «Магазин охотника и рыболова».

**Ажэшкі № 36** — Акт дзяржпрыёмкі пяціпавярховага жылога дома, пабудаванага па тыпавым праекце, быў зацверджаны 30 снежня 1965 г. Краму «Башмачок», якая знаходзілася на першым паверсе, дзяржкамісія прыняла ў маі 1966 г.

**Ажэшкі № 37 — Басняцкі домік, Дом майстра, музей «Гісторыя Гарадніцы».** Пабудаваны каля 1765 г. паводле праекта архіт. Ю. Мёзера ( згодна з І. Трусавым, пабудаваны па праекце архітэктара Дж. Сака ). Рэстаўраваны ў 1990 г. па праекце У. Барсукова — В. Калніна.

**Ажэшкі № 38** — Рашэнне пра будоўлю дома было прынята ў красавіку 1965 г. У 1967 г. адчынена выставачная зала гродзенскай абласной арганізацыі Саюза мастакоў БССР, працуе кнігарня «Школьнік».

**Ажэшкі № 41 — Дом Ямонта.** Пабудаваны ў пачатку XX ст., перабудаваны ў 80-я гады XX ст., пасля чаго страціў у значнай ступені сваю арыгінальнасць. У 1960-70-я г. дом выкарыстоўваўся пад інтэрнат.

Пляц перад **крамаю “Бирюза”** - Тут стаяў зараз неіснуючы двухпавярховы цагляны будынак па адрасу вул. Ажэшкі № 44. На 1926 г. працаваў рэстаран Ю. Шаверскага. На 1937 г. – гатэль «Krakowski». Пасля вайны, да канца 1945 г. – чыгуначны рэстаран пры вакзале станцыі Гродна. У верасні 1944 г. другі паверх быў перададзены вайсковай пракуратуры Беластоцкай чугункі. У 1950 г. тут знаходзілася абласная спецпаліклініка.

**Ажэшкі № 45** —. **Дом Эпштейна**. Год пабудовы — 1900.

7 ліпеня 1948 г., пад памяшканне на першым паверсе, якое займаў часны фатамайстар Нікалаяў, было па рашэнню выканкама перададзена пад краму школьных прыналежнасцей. У другой часцы дома на першым паверсе знаходзілася піўная трэста сталовых і рэстаранаў, якую ў верасні 1950 г. передалі пад кварціру. У 1970 г. у будынку працавала крама № 14 “Сорочки”.

**Ажэшкі № 47 — Дом Мечыслава Карповіча**. Пабудаваны ў 1909 г..

У жніўні 1947 г. памяшканне майстэрні па рамонту вопраткі на першым паверсе дома было перададзена пад аптэку. У 1960-я г. тут працавала крама агародніны.

**Ажэшкі № 49** — Год пабудовы – 1960. На першым паверсе размясціліся: харчовая крама “Спутник”, стаматалагічная паліклініка, упраўленне “Гродноэнерго” ды домаўпраўленне № 1 у 3-м под’ездзе дома. У наступныя гады тут знаходзіліся: “ЗАГС” Кастрычніцкага раёна, Фонд культуры, Турбюро, лабараторыя праблем культуры рэгіёна ГрДУ імя Я.Купалы.

Дом быў адным з першых у горадзе з цэнтральным ацяпленнем і гарачай вадою (тады большасць гарадскіх шматпавярховікаў ацяплялася ўласнымі кацельнымі, а вада падагравалася газавымі калонкамі ў кватэрах). Менавіта таму сярод першых жыхароў дома былі першы сакратар гаркома партыі, старшыня гарвыканкама, рэктары медыцынскага і сяльгас інстытутаў, наместнік старшыні абласнога суда і іншыя кіраўнікі вобласці і горада.

### Антонава

**Антонава № 25 — Рэдакцыйна-выдавецкі корпус газеты «Гродзенская праўда».** Пабудаваны ў 1985 г. Аўтар праекта — архітэктар Л. Вільчко. «Гродзенская праўда» выходзіць з кастрычніка 1944 г., як орган абласнога і гарадскога камітэта КПБ ( У свой час у рэдакцыі газеты працавалі М. Васілёк, В. Быкаў, А. Карпюк, Ю. Голуб, А.Качан і інш. ).
**Мемарыяльная дошка генералу А. Антонаву** - На будынку рэдакцыі газеты «Гродзенская праўда». Першапачаткова была ўсталявана ў 1965 г. на доме, у якім ён нарадзіўся, па Антонава № 23. У 1988 г. *у доме быў* адчынены музей. Пазней у гэтым будынку знаходзілася крама «сэкандхэнду». Дом разабраны ў 1990-я гг.
**Праваслаўныя могілкі // Старыя, Рускія, Сафійскія, Ерусалімскія, могілкі па Антонова.** На пачатку ХХ ст. увесь гэты раён разам з каталіцкімі і вайсковымі могілкамі (гл. вуліца Белуша) называўся «Кладбищенской слободой».

Галоўнай тэмай манументальнага мастацтва савецкага Гродна з'яўлялася тэма ахвяраў Вялікай Айчыннай вайны. Адразу пасля вызвалення горада ўжо 11 снежня 1944 г. мясцовым Саветам дэпутатаў было прынята рашэнне аб узвядзенні помнікаў салдатам, загінуўшым пры вызваленні Гродна. Помнікі павінны былі паўстаць на праваслаўных могілках, дзе размяшчалісь дзьве брацкія магілы.

Аднак, адным з першых – у 1945 г., з'явіўся абеліск на магіле Разанава: кіраўніка антыфашысцкай групы ў Гродна. Помнік на магіле ста дваццаці савецкіх ваеннапалонных у выглядзе скульптуры воіна з аўтаматам і дзяўчыны з лаўровым вянком – знакам перамогі, быў пастаўлены толькі ў 1957 г.. У 1958 г. помнік – жанчына-маці ў жалобе, з'явіўся на магіле пяцісот сямідзесяці воінаў, партызан і мірных жыхароў, якія загінулі ў Вялікую Айчынную вайну. У 1959 г. скульптура воіна пастаўлена на магіле, дзе пахаваны астанкі чатырыста дзевяноста савецкіх салдатаў, якія загінулі ў баях у ліпені 1944 г.

## Б

### Белуша

**Вайсковыя могілкі** — Закладзены ў 1888 г. Тут хавалі так сама салдатаў, якія загінулі ў бальшавіцка-польскай вайне 1920 г., пахаваны савецкія воіны, якія загінулі ў 1939 і 1944 гг., а таксама ваеннапалонныя Чырвонай Арміі і нямецкія салдаты і ваеннапалонныя.

9 мая 1979 г. быў адчынены помнік у гонар чырвонаармейцаў, загінуўшых пры вызваленні Гродна ў 1939 і 1944 г.г.. – "Заўсёды напагатове", аўтары якога скульптар У. Церабун і архітэктар А. Каралькоў. Ён прадстаўляе сабой фігуру воіна вышынёй 7,5 м, які нібы стаіць на варце. Кля помніка ўладкаваны тры бетонныя блокі ў выглядзі зорак з подпісамі-прысвячэннямі.

На пачатак 1990-х гг. па прапанове польскага культурна-асветніцкага таварыства імя А. Міцкевіча на могілках быў збудаваны знак-крыж жыхарам Гродзеншчыны – афіцэрам польска арміі, загінуўшым у час сталінскіх рэпрэсій. На крыжы тэкст на польскай мове: "Старабельск. Асташкаў. Катынь. 1940 г." ды "Жыхарам горада Гродна – афіцэрам Войска Польскага, расстраляным у сталінскіх лагерах" на беларускай і польскай мовах.

### Будзёнага

**Будзёнага № 2 // Свердлава № 1 — Яўрэйская грамадская бальніца, 3-я гарадская бальніца, Будынак вузлавой чыгуначнай бальніцы.** Восенню 1939 г.ператвораны ў 3-ю гарадскую бальніцу. 12 лютага 1944 г.

**Будзёнага № 36 — Дом Муратава**. Пабудаваны на пачатку XX ст.

На ліпень 1945 г. – чыгуначная міліцыя, трыбунал ды пракуратура Гродзенскага раёна.

**Будзёнага № 37 — Будынак чыгуначнага вакзала.** Пабудаваны ў 1986 г. са шкла ды бетона як "заходнія вароты" СССР.

Старая чыгуначная станцыя была пабудавана ў 1868 г. з цэглы замест часовай драўлянай. Мела элементы стылю класіцызму. 21 верасня 1939 г. тут знаходзіўся польскі штаб абароны Гродна генерала Пшэдэцкага. У Вялікую Айчынную вайну разбураны, адноўлены ужо ў 1945 г., як раз да дня Савецкай Канстытуцыі.

"5 снежня, - пісала "Гродненская правда", - адчыняецца новы, добра абсталяваны вакзал станцыі Гродна. Пры вакзале ёсць пакоі адпачынку, маці і дзіця, афіцэрскі, урадавы, рэстаран, зала чакання. Усе пакоі абсталяваны мягкай мэбляй, засланыя дыванамі, на сценах люстры, партрэты і карціны. Прыгожа аформлена зала чакання. Яго сцены ўпрыгожаны партрэтамі правадыроў і членаў ураду, лозунгамі, плакатамі. У кожным прасценку на прыгожы' тумбачках стаяць кветкі, на відным месцы – прыгожая вітрына для цэнтральных газет". Пры аднаўленчых работах над галерэямі надбудаваны другі паверх, дабудаваны двухпавярховы корпус са службовымі памяшканнямі. У цэнтральнай часцы знаходзіліся касы, зал для пасажыраў, цырульня, бюро "Інтурыста", у якім у 1960-я гады працаваў вядомы беларускі пісьменнік А.Карпюк. У правым крыле ад централнага ўвахода знаходзіўся рэстаран. У левым – у розныя часы працавалі чакальная зала *(пасля 1979 г. – зал дагляду мытні)* ды мытня. На другім знаходзіліся службовыя памяшканні, дыспетчарская, кабінет кіраўніка вакзала. У 1986 г., нягледзячы на пратэсты з боку некаторых мясцовых інтэлігентаў, вакзал быў разбураны.

**Прывакзальная плошча** - З адкрыццём чугуначнай лініі "Санкт-Пецярбург – Варшава" у 1868 г. у Гродна быў пабудаваны чугуначны вакзал, які за даўгія гады свайго існавання быў неад'емнай часткай гарадскога пейзажу.

Пасля будаўніцтва вакзала сфармавалася Прывакзальная плошча. Да плошчы сыходзіліся тры вуліцы: Ажэшкі, Будзёнага і Ціміразева (сёняшнія назвы). Брукаваная плошча мела выгляд прамавугольніка. Яе кампазіцыйным цэнтрам з'яўлялася круглая клумба, па перыметру якой раслі дрэвы. У 1915 г. тут былі закладзены імправізаваныя вайсковыя могілкі (у раёне вакзала ішлі зацятыя баі, сам вакзал згарэў). У 1920-я гады плошча была добраўпарадкавана, аднак зноў моцна пацярпела пад час Другой сусветнай вайны. Чарговы раз добраўпарадкавана пасля вайны: на клумбе пасадзілі новыя дрэвы, а побач з вакзалам была ўсталявана гіпсавая скульптура ў выглядзе седзячых на лаве Леніна і Сталіна. Пазней яе перанеслі ў гарадскі парк, а ў цэнтры клумбы ўсталявалі помнік аднаму Сталіну.

У сярэдзіне 1950-х гадоў прывакзальная плошча заставалася дастаткова занядбаным кутком правінцыйнага горада: вузкія, брукаваныя вулачкі, аднапавярховая забудова, дамы, якія даўно не бачылі рамонту, перакошаныя платы і вялікая колькасць піўных. Да таго ж побач працякала Гараднічанка, якая была месцам стокаў з навакольных прадпрыемстваў, устаноў і дамоў.

На плошчу траплялася адразу па выхадзе з вакзала. Па правую руку ад выхада стаяла два двухпавярховыя будынкі. Будынак, які адным з фасадаў выходзіў на перон, займала мытня і кантрольна-прапускны пункт памежных войск. Гэты дом хутчэй за ўсё быў моцна перабудаваным у міжваенны час будынкам дапаможнага станцыйнага будынка У другім будынку – на куце плошчы і вул. Будзёнага, месцілася паштовая служба. Далей па Будзёнага была чыгуначная баня.

На супрацьлеглым баку плошчы знаходзіліся будынкі багажнага аддзялення: адно – прыбудавана да рэстарана, другое, двухпавярховае, стаяла на куце побач. Паміж імі і пакгаўзам (апошнім часа – склады "Пінскдрэва") знаходзіўся клуб чыгуначнікаў (зараз на гэтым месцы будынак пошты).

На пачатак 1957 г. было прынято рашэнне аб адкрыцці праз Гродна міжнароднага транзітнага чыгуначнага руху, пасля чаго паўстала рашэнне аб рэканструкцыі плошчы. На працягу 1957-60 гг. была запраектавана будоўля адразу некалькі шматпавярховых дамоў у раёне вуліц Ажэшкі і Ціміразева, у тым ліку - інтэрната.

У канцы 1962 г. была скончана будова дома па вул. Ажэшкі № 49, вядомага гарадзенцам тым, што з першага дня там працавалі гандлёвая крама "Спутник" ды стаматалагічная паліклініка. Плошча пашырылася коштам вуліцы Ажэшкі паміж новым домам і захаваўшымся без зменаў левым бокам вуліцы. На новай яе часцы было зроблена гэткае ж пакрыццё, як і на старой. Пасля гэтага плошча набыла той выгляд, які мела да пачатку 1980-х гг.

Ужо ў кастрычніку 1962 г. было прынята рашэнне аб буданіцтве дома, аналагічнага дому № 49 сіметрычна восі галоўнага будынка чыгуначнага вакзала. За гэтым будынкам па вуліцы Ціміразева павінен быў вырасці яшчэ адзін шматкватэрны дом, што было вырашана 15 жніўня 1963 г. Адпаведна з новым генеральным планам развіцця Гродна два сіметрычных будынка павінны былі стаць своеасаблівымі варотамі горада. План гэты аднак ніколі не быў рэалізаваны, што, аднак, не выратавала прывакзальную плошчу ад непрадуманага і не цалкам абгрунтаванага знішчэння.

На тым месцы, дзе цяпер паварот в бок крамы "Спорттавары" было скрыжаванне вуліц Ажэшкі і Ціміразева. На месцы цяперашняга павільёна "Інтакс" па продажы аўтобусных білетаў, знаходзіўся маленькі драўляны будынак з цырульняй. Пастрыгчыся тут каштавала ўсяго 10 капеек. Працаваў тут вядомы майстар І. Меерові‌ч, вядомы гараджнам яшчэ з "польскага часу". Пазней цырульня была перанесена ў дом № 42, дзе І. Меерові‌ч працаваў да свайго апошняга часу.

За цырульняй на тым самым баку вуліцы да скрыжавання Ажэшкі – Будзёнага стаялі два дамы – аднапавярховы і двухпавярховы. У глыбіні за імі стаяў вялікі трох-пяціпавярховы будынак вайсковых казармаў, узнесены ў другой палове XIX ст. Пасля высялення вайскоўцаў тут была наладжана вытворчасць аўтамабільных магнітолаў "Гродна". Казармы былі разбураны адначасова з вакзалам ў 1986 годзе. Між тым разам з вакзалам у адрэстаўраваным вяглядзе яны маглі б стаць сапраўдным упрыгажэннем прывакзальнай плошчы.

Злева ад цырульні пачыналася вуліца Ціміразева, правы няцотны бок якой быў забудаваны аднавярховымі дамамі няцотнага тыпу. Сёння ў крыху перарobленым выглядзе ацалеў толькі будынак зоокрамы "Лагуна". Да вайны размешчаныя тут будынкі (дом меў № 13) належалі Адаму Людвікавічу Садоўскаму. Тут размяшчаліся два драўляных жылых дома плошчай 137 кв.м. і будынак былой карэтнай плошчай 270 кв.м. У 1948 г. гэтыя будынкі займала чыгунка. У карэтнай месціліся майстэрні. Рашэннем выканкама майстэрні ў ліпені 1949 г. былі перададзены заапарку.

На куце вуліц Ажэшкі і Ціміразева у невялікіх аднапавярховым доме была крама гаспадарчых тавараў. Далей за гэтым домам па Ціміразева в двухпавярховым будынку месцілася чыгуначная санэпідстанцыя. На месцы дома дома № 42, які быў збудаваны ў сярэдзіне 1970-х гг. з крамай "Спорттавары", аптэкай, цырульняй і банкам, знаходзілася малапавярховая забудова, цякла Гараднічанка і за ёй была разбіта спортпляцоўка школы №2. Зімой на лёдзе замерзлай Гараднічанкі гулялі ў хакей.

У памяшканні "Спорттавараў" да канца 1970-х гг. была крама "Мелодия", якую пасля перавялі ў новы будынак па вуліцы Горкага.

У 1986 г. стары вакзал быў разбураны. Як паказаў час, рашэнне аб яго зносе было заўчасным і непрадуманым.

## Г

### Гарнавых

**Гарнавых № 5** – З чэрвеня 1945 г. па чэрвень 1947 г. – “Гродненский техникум гражданского строительства Министерства жилгражданстроя БССР”. Рашэннем выканкама Гарсавета 9 чэрвеня 1947 г. у будынку была адчынена беларуская школа № 9. У жніўні 1961 г. яна была рэарганізавана ў 11-гадовую палітэхнічную школу з выкладаннем нямецкай і ангельскай мовы. У маі 1949 г. у скверы перад будынкам школы быў усталяваны понік Леніну ( у чэрвені 1969 г. гэты помнік быў перададзены ў Зельву ).

**Месца гібелі старшага палітрука Р. Гарнавых** — Палітрук Р. Гарнавых загінуў 20 верасня 1939 г. у час савецка-польскіх баёў за Гродна. У 1965 г. на месцы яго гібелі ўстаноўлены мемарыяльны знак. .

**Гарнавых № 17 — Палац хімікаў, філармонія.** Год пабудовы — 1974. Прыклад універсальнага клубнага збудавання.

Месца на скрыжаванні сучасных вуліц Гарнавых і Савецкіх памежнікаў, на якім зараз месціца палац, у народзе меў назву “**п'яны вугал**”. Сам тапонім, хутчэй за ўсё, з’явіўся пасля вайны, калі 17 кастрычніка 1944 г. была адчынена піўная крама піўзавода № 23. Меньш чым праз год – у жніўні 1945 г. у доме па адрасе №12/1 з’явілася крама па продажу “прохладительных напитков” у тым ліку і піва. 19 верасня 1946 г. згодна з рашэнням Гарвыканкама: «Торговое помещение по улице Горновых №15, состоящее из двух комнат, занятое конторой Заготживскот под склад овса, передать тресту столовых и ресторанов под коммерческую чайную». Чэрвень 1951 г. – з рашэння выканкама: «Закрепить за Гродненским трестом столовых и ресторанов земельный участок на углу улиц Горновых и Советских пограничников для строительства павильона столовой». Такім чынам на скрыжаванні вуліц паўстала адразу чатыры ўстановы, якія гандлявалі півам. У кастрычніку 1968 г. пачаўся знос будынкаў «пьянага угла» пад будоўлю Палаца хімікаў. Дарэчы, у сакавіку 1972 г. тут быў знесены і дом, дзе жылі кроўныя каталіцкага біскупа Тадэўша Кандрусевіча.

### Горкага

**Горкага № 1 — Комплекс будынкаў гарадской (акружной) лячэбніцы.** Пабудаваны ў 1895-1912 гг. Архітэктары М. Плотнікаў і інжынер Л. Сямёнаў.

З 5 жніўня 1944 г. у будынку месціліся часткі памежных войск НКУС.

**Горкага № 2/2 — Палац віцэ-адміністратара.** Пабудаван у у 1776—1793 гг., як частка коплексу Гарадніцы. Архітэктар І. Мёзер.

У 1946 г. тут адчынілі гарадскі дом піянераў. З 1947 г. – спецыяльнае рамесленае вучылішча. У 1952 г. увесь комплекс разам з флігелямі быў канфіскаваны савецкімі ўладамі. Тут знаходзіліся навучальныя ўстановы Гродзенскага медінстытута. У канцы 1950-х г. галоўны корпус і флігелі былі капітальна адрамантаваны.

**Горкага № 2 — Паўднёвы флігель палаца адміністратара.** Пабудаваны ў 1783-1793 гг. па праекце Дж. Сака як "кухня і служба". Пасля Другой Сусветнай вайны – нацыяналізаваны. На 1970 г. – база “Белбакалея”.

**Горкага № 2а — Паўночны флігель палаца адміністратара, казармы Якавюка, сядзіба Расійскага дабрачыннага таварыства.** Пабудаваны ў 1783-1793 гг. па праекце Дж. Сака. У 1980-я гады тут знаходзіліся гаражы памежнага атрада, якія ў 1997 г. былі перададзены епархіі.

**Горкага № 2/1** – На 1957 г. тут знаходзілася СШ № 3.

**Горкага № 3 — Крама Залмана Глазера**. Год пабудовы — 1915. На 1950 г. – база “Главтабак”.

**Горкага № 23 — Аптэка Генрыха Юдэйкі, гарадская аптэка № 2.** Аптэка была адчынена восенню 1936 г. Ужо ў 1939 г. яна атрымала канцэсію ад гарадскіх уладаў на абслугоўванне мясцовага шпіталя. Пазней – нацыяналізавана. З 1944 г. на другім паверсі быў інтэрнат фармацэўтаў.

**Горкага № 47а — Гарадскі асабняк**. Тыповы гарадскі асабняк 1930-х гадоў у стылі сэцэсі.

Па некаторых звестках, будынак быў часткай «Паштовай калоніі», раёна горада, выдзеленага для пасялення паштовых чыноўнікаў. У пасляваенныя гады тут знаходзіўся тайны гатэль Абласнога камітэта КПБ(б), дзе неафіцыйна прымалі дэлігацыі нацыянальных дзеячоў з Анголы, Мазамбіка, Нікарагуа ды іншых дзяржаваў, якія вялі барацьбу з “каланіяльнымі” ўрадамі.

**Горкага № 72 — Дом тэхнікі.** Пабудаваны ў 1984 г. па праекце архітэктараў В. Бажко і У. Праабражэнскага. Прыклад грамадскага збудавання новага тыпу.

**Горкага № 80 — Галоўны корпус медыцынскага інстытута.** Пабудаваны ў 1975 г. Архітэктары Л. Вільчко і В. Давыдзёнак. Прыклад вучэбных збудаванняў савецкай архітэктуры 1970-х гадоў.

**Помнік савецкім воінам, загінуўшым у Аўганістане** – У скверы на перакрыжаванні вул. Горкага ды Курчатава. Аўтар А. Салятыцкі. Узведзены ў 1992 г. Уяўляе сабой постаці дзьвух салдат на фоне расколатых камянёў. Яны стаяць абняўшыся плячом к плячу, памінаючы загінуўшых. Адзін з іх апусціў зброю. На помніку выбіты словы: “Сынам Гродзенскай зямлі”.

Усяго з Гродна і Гродзеншчыне ў Афганістане праходзіла службу 2650 чалавек. З іх 78 чалавек вярнулася інвалідамі; 12 – пахавана непасрэдна ў Гродна.

**Мазаіка на фасадзе завода “Радыёпрыбор”** – Аўтары: А. Салятыцкі, А. Гаршкавоз, А. Клімянкоў, У. Церабун, Г. Буралкін ды інш.. Адзін з найбольш значных помнікаў манументальнага жывапісу Гродна. Паступова разбураецца.

## Д

### Дзяржынскага

**Дзяржынскага № 1 — Тэатры.** — Год пабудовы — каля 1793. Дзяржяўны польскі тэатр БССР пад кіраўніцтвам А. Вянгеркі, вандроўны Дзяржаўны польскі тэатр лялек БССР (1940 — 1941 гг.), Дзяржаўны рускі драматычны тэатр БССР (1945 — 1947 г.г.), абласны драматычны тэатр, Гродзенскі абласны тэатр лялек (з 1984 г.).

**Мемарыяльныя дошкі ў памяць аб першым пасяджэнні Савета рабочых дэпутатаў Гродна ў 1919 г. і першай сесіі Гродзенскага гарадскога Савета дэпутатаў працоўных у 1939 г.. -** Усталявана на будынку тэатра ў 1958 г.

**Дзяржынскага № 1/1 — Народны дом.** Пабудаваны Ў 1904 г. паводле праекта Л. Лангада і М. Раманава.

У жніўне 1944 г. рашэннем выканкама Горсавета “Аб стацыянаванне ў Гродна Беларускага дзяржаўнага ансамбля песні і танца” пад кіраўніцтвам Р.Шырмы будынак быў замацаваны за ансамблям і «Студией по подготовке музыкантов на народных инструментах». З верасня 1945 г. – Гродзенская філармонія. У чэрвені 1949 г. будынак перададзены пад парткабінет Гродзенскага гараскога камітэта КП(б)Б.

**Дзяржынскага № 8 — Пакгауз на Гарадніцы, школа № 10.** Пабудаваны у 1765-1780 гг.

На 1950 г. у будынку працавала сярэдняя школа № 7. З 1 верасня 1955 г. будынак новапабудаванай школы заняла пераведзеная з вул. К.Маркса чугуначная школа № 45. 28 снежня 1960 г. яна пераімінавана ў сярэднюю школу № 10. Зараз уваходзіць у комплекс забудоў СШ № 10.

**Дзяржынскага № 15, 17— Казармы 4-га генерал-ад'ютанта графа Татлебена сапёрнага батальёна, казармы імя Панятоўскага, казармы 29 ПД, “Drukarnia dowództwa Okręga**

**korpusu - DOK № III", Вайсковы шпіталь.** Год пабудовы — 1895. Аўтар праекта — вайсковы інж. генерал-маёр Штатман. Эклектыка.

**Дзяржынскага № 28 — Гродзенскае меснае ўпраўленне расійскага таварыства «Красного креста».** Год пабудовы — 1914.

У 1950 г. – дзіцячы дом № 2. У 1960-пачатку 1970-х г.г. будынак займала Гродзенскае Культпрасветвучылішча. На 1973 г. – тут знаходзіўся палітэхнікум. Аўташкола (1939-41), Культпрасветвучылішча, палітэхнікум, корпус мастацкага аддзялення Гродзенскага дзяржуніверсітэта.

**Дзяржынскага № 30 —** Пабудаваны на пачатку XX ст. Пасля вайны – інфекцыйны шпіталь.

**Мемарыяльная дошка камсамольцам-падпольшчыкам**. На будынку гарадскога прафесійна-тэхнічнага вучылішча № 7 ( Дзяржынскага № 41/2 ). Устаноўлена ў 1967 г. на ўшанаванне памяці членаў скідальскай падпольнай камсамольска-маладзёжнай арганізацыі А. Роліка і І. Шчаснага, якія ў 1939 — 1941 г.г. вучыліся ў былым рамесным вучылішчы. Схоплены і павешаны нямецка-фашысцкімі захопнікамі 13.9.1942 г.

**Аўтастаянка (Былы цагельны завод)** - У ліпені 1944 г. месца бою 508-га стралковага палка.

## З

### Замкавая

Сквер на рагу плошчы Савецкай і вуліц Замкавай і Кастрычніцкай — месца знаходжання былой **Фары Вітаўта.** Тут прыкладна ў 1389 г. вялікім князем літоўскім Вітаўтам быў заснаваны першы каталіцкі храм горада. У пасляваенныя часы будынак передавалі па чарзе некалькім гандлюючым арганізацыям пад складскія памяшканні – Гархарч праму, базам Галоўабутакзбыт і Галоўтрактарзбыт і Універмагу. Апрача гандлёвых у касцёле доўгі час размяшчаліся склады ваенна-вучэбнага цэнтра ДАСААФ і тонкасуконнага камбіната. Магчыма, з 1958 г. тут быў інтэрнат медінстытута (адрас — Замкавая № 1).

У пачатку 1958 г. у горадзе паўстала неабходнасць у будаўніцтве шырокафарматнага кінатэатра. Аднак першапачаткова вырашылі не ўзводзіць новы будынак, а прыстасаваць адно з наяўных у горадзе памяшканняў пад кінатэатар. У сакавіку 1958 г. гарвыканкам прымае рашэнне "Аб дазволе рэканструкцыі будынка былога гарнізоннага касцёла па вуліцы Савецкай у горадзе Гродна пад шырокаэкранны кінатэатр". У дакуменце сцвярджалася, што "прыймаючы пад увагу, што будынак былога гарнізоннага касцёла ў горадзе Гродна мае добрыя сцены і зручныя прыстасаванні пад кінатэатар, апрача таго, зямельны участак знаходзіцца на цэнтральнай плошчы горада, выканкам Гродзенскага гарадскога Савета дэпутатаў працоўных вырашае:

Перадаць упраўленню культуры Гродзенскага аблвыканкама былы будынак гарнізоннага касцёла па вуліцы Савецкай для рэканструкцыі пад шырокаэкранны кінатэатр".

Перабудова касцёла у кінатэатр так і не пачалася, аднак у яго з'явілася перпектыва пераўтварыцца спартыўную залу. У лістападзе 1959 г. з'яўляецца новая пастанова гарвыканкама, якая павінна была вырашыць лёс касцёла: "Перадаць Гродзенскаму гарадскому Савету Саюза спартыўных таварыстваў і арганізацый будынак былога касцёла па куце вуліц Замкавай і Кастрычніцкай для рэканструкцыі яго пад гарадскі Дом фізічнай культуры і замацаваць за ім зямельны участак плошчай 0,64 га".

Рэканструкцыя як пад кінатэатар, так і пад Дом фізкультуры прадугледжвала змену знешняга выгляда касцёла, і найперш страту яго вежы-званніцы, адной з дамінантаў горада.

8 сакавіка 1961 г. Гродзенскі гарвыканкамам прыняў пастанову № 213 «Аб зносе аварыйнага будынка ваеннага касцёла на плошчы Савецкай». Для выканання рашэння гарвыканкама была ўтворана спецыяльная камісія ў складзе: намесніка старшыні

Гродзенскага гарвыканкама В. Тупоўскага, начальніка міліцыі П. Назаркіна, загадчыка прамыслова-транспартнага аддзела гаркама КПБ В. Пясэцкага, загадчыка абладдзела па справах будаўніцтва і архітэктуры М. Макарава, начальніка аддзела капітальнага будаўніцтва Гродзенскага гарвыканкама В. Ледухоўскага і дырэктара Абласнога музея Собаля. На здзяйсненне «аперацыі» з гарадскога бюджэта было выдзелена 19,5 тысячы рублёў. 29 лістапада 1961 г. у дзве гадзіны ночы рабочымі ленінградскага «Ленвыбухпрома», мясцовымі вайсковымі сапёрамі і супрацоўнікамі КДБ загад аб зносе храма быў выкананы. Тое, што засталося ад Фары Вітаўта, было выкарыстана для часовага пакрыцця праезнай часткі вуліцаў, ходнікаў і дарожак. Нейкая частка друза пайшла на добраўпарадкаванне забалочаннага вучастка ўздоўж сёняшняй вуліцы Суворава. Рэшткамі касцёла вымасцілі так званую "генеральскую дарогу", якая вядзе ад Друскеніцкай шашы да вайсковага назіральнага пункта.

Паводле некаторых звестак, гарадзенцы спрабавалі абараніць свой касцёл. Напрыклад такім жэстам адчаю быў званок у гарвыканкам з папярэджаннем, што ў выпадку яго ўзарвання будзе ўзарваны гродзенскі Стары мост. Пасля гэтага на мосце з'явілася ўзброеная варта (ноччу), днем жа на мосце стаяў міліцыянер, які забараняў пешаходам спыняцца на мосце.

Сквер на месцы Фары Вітаўта хацелі выкарыстаць пад будаўніцтва. У маі 1965 г. выканкам гарасавета прыняў рашэнне выдзяліць тут участак пад будаўніцтва Дома грамадскіх арганізацый, а ў лістападзе 1967 г. з'яўляецца рашэнне ўзвесці тут ужо іншы будынак – 16-ціпавярховы Дом саюзаў з залам на 400 месцаў.

**Замкавая № 5 — Камяніца Масальскіх, інтэрнат медуніверсітэта № 1.** Прыкладны час пабудовы – каля 1643 г. У 1950 г. – гандлёва-кулінарная школа. З 1970-х – інтэрнат медінстытута.

**Замкавая № 7 — Былы палац Масальскіх.** Прыкладны час пабудовы – каля 1643 г.

У верасні 1944 г. другі і трэці паверх займаў "Спиртотрест", першы – леспрамгас. З верасня 1947 г. у будынак перасяліўся " ОШОСДОР МВД БССР". У 1960-70-е гг. тут працавала прафесійнае гандлёвае вучылішча да кантора "Горпромторга".

**Замкавая № 9 — Дом Хаіма Стральца**. Год пабудовы - 1912 г.

З верасня 1944 г. у будынку працавала фармацэўтычная і фельдшарска-акушэрская школа. Займаўшы затым "ОШОСДОР МВД БССР" у 1947 г. перасяліўся ў будынак па вул. Замкавай № 7. а тут з верасня 1947 г. пачаліся заняткі ў будаўнічым тэхнікуме. На 1970 г. – "Облавтотрест".

**Замкавая № 11 — Дом калежскага саветніка Івана Лукіча Харчанкі, дом Аляксандра Харчанкі ( на 1928 ).** Год пабудовы – 1911.

У верасні 1944 г. рашэннем выканкама Гарсавета ўвесь будынак быў перададзены педвучылішчу.

**Замкавая № 12 — Магчыма, дом Лапінера**. Год пабудовы - 1880, 1904. На 1945 г. – абутковая фабрыка № 2. На 1946 г. – школа ФЗО № 33 "обувщиков".

**Замкавая № 13 — Вінная лаўка Рохлі — Руткоўскай Рахель.** Год пабудовы — 1901.

У сакавіку 1944 г. – Гродзенскі механічны тэхнікум чугуначнага транспарта. У 1960-е г.г. – інтэрнат музпедвучылішча.

**Замкавая № 16 — Палац К. Храптовіча.** Пабудаваны ў 1742 — 1752 гг.

25 верасня 1944 г. Гарвыканкам прыняў рашэнне: "Передать помещение для размещения батальона МПВО по улице Замковой, дом № 16 со всеми находящимися надворными постройками". На жнівень 1945 г. Гродзенскі будаўнічы тэхнікум "Наркомгражданстроя" БССР. У 1946 г. – школа ФЗО № 45 будаўнікоў "Министерства трудовых резервов" СССР, пазней – будаўнічае вучылішча № 16. У 1970-я г.г. – "ГПТУ № 74 бытового обслуживания" ды інтэрнат.

**Замкавая № 17 — Дом саветніка Анцылевіча.** Год пабудовы — 1912.

На 1950 г. – пажарная ахова МУС, дабраахвотнае пажарнае таварыства.

**Замкавая № 20 —Новы замак.** Будаўніцтва палаца пачалося толькі ў 1737 г. Аўтарам праекта палаца быу вядомы саксонскі архітэктар Карл Фрыдрых Пёпельман.

Адразу пасля заканчэння Другой сусветнай вайны Новы замак пачалі адбудоўваць. Работы пад кіраўніцтвам архітэктара У. Вараксіна працягваліся да 1952 г. Палац быў адноўлены ў так званым «сталінскім» ампіры. Са снежня 1952 г. у Новым замку змяшчаўся Гродзенскі абласны камітэт КПБ. У 1991 г. Новы замак быў перададзены пад установы культуры.

## К

### Касманаўтаў праспект

**Касманаўтаў праспект № 2а** — Жылы дом. Пабудаваны ў 1964 г. Першы гарадскі шматпавярхоўны будынак савецкіх часоў.
**Касманаўтаў праспект № 2б — Школа гвардзейскіх реманцераў, стралковы гарадскі арсенал, артылерыйскія казармы на Скідзельскай заставе (?); вайсковыя казармы 26-й артылерыйскай брыгады, дом ДТСААФ.** Год пабудовы — 1902 (па іншых дадзеных – 1858).
**Курган славы** — Закладзены 17 верасня 1968 г на ўшанаванне памяці барацьбітоў за савецкую ўладу. Курган мае форму ўсечанага конуса, вышынёй 18 м, дыяметр асновы 56 м, вяршыні 5 м. Курган акантаваны бетонным маналітным кольцам з вонкавай мураванай абліцоўкай. З усходняга боку Кургана — плошча для правядзення мітынгаў, злева — Вечны агонь, справа — пліта з памятным надпісам. Да Кургана вядуць 2 шырокія лесвіцы. У красавіку 1974 г. каля Кургана Славы закладзена алея Герояў.

## Л

### Леніна

**Леніна № 4 — Гарадское вучылішча, Пушкінскае высшае пачатковае вучылішча, Міністэрства беларускіх спраў, сярэдняя школа № 2 імя С. Баторыя (Батароўка), муз-педвучылішча, педагагічны коледж.**
**Леніна № 9 — Сялянскі пазямельны банк, Камандаванне акругі корпуса III (ДОК III), Штаб арміі.** Пабудаваны ў 1913 г. паводле праекта архітэктара Б. Астравумава. **Мемарыяльная дошка Д. Карбышаву** - Устаноўлена ў 1965 г. на ўшанаванне памяці Героя Савецкага Саюза генерал-лейтэнанта інжынерных войск Дз. Карбышава, які ў чэрвені 1941 г. інспектаваў будаўніцтва ваенных умацаванняў у Беластоцкай вобласці і жыў у доме па сучаснаму адрасу Карбышава № 35. Надпіс па расейску гучыць: "Герой Советского союза генерал-лейтенант инженерных войск Карбышев Дмитрий Михайлович 1880 – 1945 Участник обороны Гродно в июне 1941 г.".
**Леніна № 13 — Дом Казіміра Гедройца**. Год пабудовы — 1900. Гэты будынак звязаны з дзейнасцю самых каларытных у Гродна на пачатку 1970-х гадоў хіпі.
**Леніна № 19 — Дом Марыі Залеўскай**. На верасень 1944 г. – райваенкамат. На 1950 г. – абласное ўпраўленне юстыцыі.
**Леніна № 23 — Дом Аляксандра Мазалеўскага**. Пабудаваны напрыканцы XIX ст. У 1946 г. – абласное Упраўленне Міністэрства сувязі БССР. Па стану на 1950 г. – абласны аддзел "Союзпечать", абласное упраўленнеМіністэрства сувязі БССР, транспартная кантора Міністэрства сувязі, абласны склад Мінсувязі. На 1982 г. – інтэрнат ГПТУ № 41.
**Леніна № 24** – Год пабудовы – 1957.

На першым паверсе працавала спажывецкая крама, затым “Бярозка” – крама па продажу тавараў за валюту. На первом этаже открылся продовольственный магазин. Затем – магазин по продаже товаров за иностранную валюту. У доме праз доўгі час жыў вядомы гродзенскі скульптар М.Лукьянаў.

**Леніна № 28 — Дом Мацкевіча**. Пабудаваны на пачатку XX ст. Прыгожая эклектыка. У 1970 г. – прафесійна-тэхнічнае вучылішча № 7.

**Мемарыяльная дошка ў гонар Віктара Юртава** (1946-1980). На доме па вул. Леніна № 30. В. Юртаў - маёр міліціі, які загінуў у Аўганіністане, выконваючы “інтэрнацыянальны доўг”. Пахаваны ў Гродна.

**Леніна № 34 – Гарком Партыі; “Дом Палітпроса”; корпус ГрДу**. Пабудаваны ў 1971 г. Архітэктар В. Давыдзёнак. Прыклад адміністрацыйных збудаванняў 1970-х г.

**Мост праз Гараднічанку** – Прыняты ў эксплуатацыю дзяржкамісіяй 21 лістапада 1960 г.

**Леніна плошча // Ленина площадь** — *На месы даліны р. Гараднічанкі паміж г.зв. Губернатарскім мастом і вуліцай Віленскай. Сёння плошча ўяўлее сабою прамавугольнік, абмяжаваны з трох бакоў: будынкамі гарвыканкама, гістарычнага архіва ды жылога дома. З чацвёртага боку плошча раскрываецца да парку ім. Жылібера. Перад будынкам гарвыканкама ўсталяваны помнік У.І. Леніну. Дадзены архітэктурны ансамбаль канчаткова сфарміраваўся дастаткова нядаўна - у другой палове 1980-х гадоў. Да гэтага часу імя Леніна насіла галоўная плошча квартала Гарадніцы, якая з 1992 г. атрымала назву плошча Тызенгаўза.*

*Пачатак фармаванне сёняшняй плошчы можна аднесці да 1958 г., калі на ўсходнім броўцы даліны Гараднічанкі ўздоўж вуліцы Ажэшка пачалася будоўля чатырохпавярховага дома. 30 верасня таго ж года гарвыканкам прымае рашэнне пра знос жылых дамоў № 10 і № 14 б па вул. Ажэшка. У 1960 г. дом з фотаатэлье і цырульня быў заселены. Паміж ягонай тарцовай сцяной і тым месцам, дзе зараз знаходзіцца знак нулявога кіламетра, да канца 1970-х гадоў праходзіла вул. Энгельса.*

*Затым, на пачатак мая 1966 г. надыйшоў час зносу папулярнага «Кафе-мороженого» ды суседніх забудоў. На гэтым месцы аддзелам камунальнай гаспадаркі ў ліпені-жніўні 1968 г. было праведзена добраўпарадкаванне з арганізаваннем сквера “...у гонар 50-годдзя Беларускай рэспублікі і Кампартыі Беларусі””, які тэрасамі спускаўся да самой Гараднічанцы.*

*У абшырнай даліне ракі Гараднічанцы да рэканструкцыі заставалася некалькі пабудоваў канца XIX – пачатку XX ст.. Гэта былі ў асноўным адна-двухпавярховыя жылыя дамы будынкі прамысловага і грамадскага прызначэння ( у тым ліку гарадская друкарня – гл. вул. Гараднічанскую ).*

*Згодна з генеральным планам рэканструкцыі і развіцця Гродна, які быў зацверджаны ў 1973 г., рэчышча Гараднічанцы ў гэтым месцы павінны былі ліквідаваць. У архітэктурнай майстэрні “Гроднаграмадзянпраект” архітэктара І. Мазнічко было падрыхтавана некалькі варыянтаў рэканструкцыі плошчы Леніна з уключэннем ў яе былога рэчышча.*

*Першы варыянт захоўваў маляўнічы краявід, аднак, пры гэтым зносіліся некаторыя з гістарычных будынкаў Гарадніцы. Другі праект прадугледжваў каналізацыю Гараднічанцы ды арганізаванне абшырнай плошчы са зносам амаль што ўсех гістарычных помнікаў і нават навабудаў. Нарэшце, згодна трэцяму варыянту даліна гэтак сама зачыпалася, аднак пры гэтым захоўвалася гістарычная забудова тагачаснай плошчы Леніна. Аднак, ніводзін з праектаў не быў рэалізаваны ў поўным аб’ёме...*

*24 ліпеня 1974 г. гарвыканкам прыняў рашэнне, паводле якога “...за аснову для далейшай пераапрацоўкі прыняць варыянт з частковай засыпкаю поймы ракі Гараднічанцы дзеля арганізацыі транспартнага руха”. Першапачаткова, да канца 1970-х гадоў, засыпалі даліну ад Губернскага маста да гаркама партыі, у выніку чаго адкрыўся краявід на*

*малапрывабныя задвокі па вул. Ажэшка ды 11 Ліпеня, а горад застаўся без свайго прыгожага арачнага маста. Затым шматлікія сараі ды ветхія пабудовы так сама былі знесены і ў жніўні 1978 г. гарвыканкам дазволіў прыбудову да будынка гаркама дзеля размяшчэння там Ленінскага райкама партыі і райкама камсамола. Адначасова дваровы фасад будынка архіва быў схаваны за вялікм пано з заклікам да гарадзенцаў аб выкананні рашэнняў чарговага з'зда КПСС.*

*У жніўні 1985 г. гарвыканкам прыняў рашэнне а пачатку будаўніцтва Ленінскаага райвыканкама, а ў лістападзе таго ж года – аб будаўніцтве новага гарвыканкама. У студзені 1986 г. былі зацверджаны працоўныя чарцяжы праекта па добраўпарадкаванню першай чаргі плошчы Леніна па праекце архітэктараў А. Пархуты і Б. Шмыгі. У верасні 1987 г. гарвыканкам прыняў рашэнне пра знос флігеля: "З мэтаю фарміравання адзінай архітэктурна-планіровачнай кампазіцыі забудовы і добраўпарадкавання рэканструіруемай часткы плошчы горада імя У.І. Леніна". 30 снежня 1987 г. быў зацверджаны акт дзяржпрыёмкі добраўпарадкаванай плошчы Леніна. Агульны кошт рэканструкцыі склаў па тых цэнах 900 тыс. рублёў ( Цікавая дэталь: бетонныя пліты на плошчы падзелены базальтавай шашкай яшчэ з часоў міжваеннай Польшчы, якую пазней знялі з праезжай часткі вуліц ).*

*Тады ж было знята пано побач з архівам, а на самой плошчы ўсталяваны пяціметровы помнік У.І. Леніну, працы народнага мастака БССР, Героя Сацыялістычнай працы скульптара Заіра Азгура За пасляваенны перыяд, гэта быў ужо трэці па ліку помнік Леніну ( Першы быў адчынены па рашэнні гарвыканкама яшчэ на пачатакверасня 1947 г. узамен знішчанага акупантамі. Пасля яго перанеслі на вул. Гарнавых і ўсталявалі перад будынкам сярэдняй школы № 9, а яшчэ пазней па просьбе кіраўніцтва Зельвінскага раёна помнік быў перавезены ў райцэнтр. Да дзесяцігоддзя ўз'яднання беларускага народа ў кастрычніку 1949 г. на тагачаснай плошчы Леніна быў адчынены новы помнік, які прастаяў там да 1987 г. І першы, і другі помнікі ўяўлялі сабою гіпсавы штампоўкі і неўяўлялі ніякай мастацкай каштоўнасці ). Новы Ленін аказаўся амаль на тым самым месцы, дзе раней знаходзілася гродзенская друкарня...*

**Леніна плошча № 2/1 — Гродзенскі гарвыканкам.** Пабудаваны ў 1971 г. для гаркама КПБ. Архітэктар В. Давыдзёнак. Прыклад адміністрацыйных збудаванняў 1970-х гадоў.
**Помнік Леніну** — Аўтар З. Азгур. Устаноўлены ў 1987 г.

## М

### Маркса

**Маркса № 1 — "Батароўка", дом Лапіна, гатэль "Бристоль".** У верасні 1944 г. - аддзел школы Беластоцкай чыгункі. У 1947 г. вячэрняя чыгуначная СШ № 5 працоўнай моладзі; на 1950 г. – сярэдняя школа № 45 Брэст-Літоўскай чыгункі. Тады ж у будынку працаваў дзіцячы садок № 7.
**Маркса № 4 — Частка комплекса іезуіцкага калегіўма, дом праваслаўнага духавенства.** Пабудаваны ў XVIII ст. як бурса для студэнтаў езуіцкага калегіўма. З кастрычнік 1944 г. і да сярэдзіны 1970-х – клуб чугуначнікаў. Пазней – да 1975 г. – клуб будаўнікоў.
**Маркса № 6 — Дом Цырлі Булькаўштэйн (Булковштейн).** Год пабудовы — 1873. У 1945 г. крама № 11 "Горпищепромторга". У лістападзе 1958 г. адчынена крама падпісных выданняў. У 1970 г. – адчынілася пераплётная майстэрня. На 1982 г. – крама ўцанённыных тавараў.
**Маркса № 8 — Дом Каўфмана; дом Фрэйды Кабак.** Пабудаваны ў другой палове XIX ст. Эклектыка. На снежань 1944 г. – кінарамонтныя майстэрні. У 1946 г. адчынілася

камерцыйная хлебная крама. У 1956 г. - “Облкультремснаб” Гродзенскага абластнога упраўлення культуры.

**Маркса № 9 — Дом Іоффе, дом Міхеля Сярэбранага**. Год пабудовы — 1904. На 1950 г. – “ОРС облстройтреста”. У 1970 г. – крама “Кристалл”.

**Маркса № 10 — Дом Хірша Борэра, дом Прусака.** Пабудаваны ў другой палове XIX ст. У 1960-е гады ў будынку дзейнічаў пнеўматычны цір.

**Маркса № 11 — Дом Абрамскага**. Год пабудовы — 1861. На студзень 1945 г. – абласны будтрэст. З верасня 1951 г. – абласны камітэт “ДОСААФ”. У 1970 г. – “Горпищеторг”.

**Маркса № 15 — Дом Длугача** (?)**, Якава Берковіча** (на канец 1920-х г.г.). Год пабудовы — 1885. У 1960 г. – крама № 46 “Детская обувь”. У 1968 г. адчынілася крама “Канцтовары”.

**Маркса № 22 — Дом Бартноўскага**. Год пабудовы — 1870 (магчыма паміж 1870 і 1885 гг.). У лютым 1972 г. гарвыканкамам было прынята рашэнне пра капітальную перабудову дома “с выравниванием мансарды до уровня 3-го этажа”. У 2006 г. выведзены з жылога фонда і знаходзіцца пад пагрозай разбурэння.

**Маркса № 27 — Касцёл Дабравешчання Найсвяцейшай Дзевы Марыі, кляштар Брыгітак, сталярныя майстэрні, псіханеўралагічны дыспансер — «псіхушка».** Гродзенскі жаночы кляштар ордэна святой Брыгіты заснаваны ў 1634-1642 гг. У 1950 г. – дзіцячы сад № 7. Пазней у будынках кляштара быў размешчаны псіханеўралагічны дыспансер і іншыя медыцынскія ўстановы. У касцёле, які быў зачынены, у 1970-1980-я гг. праводзіліся рэстаўрацыйныя работы з мэтай стварэння ў ім канцэртнай залы. У 1990 г. касцёл быў перададзены вернікам рымска-каталіцкай царквы. Пасля заканчэння рамонту касцёл быў асвечаны 2 чэрвеня 1992 г.

**Маркса № 29— “Дом сувязі”.** Год пабудовы — 1968. Аўтары праекта архітэктары Г. Тарасевіч і Л. Вільчко. У апрацоўцы інтэр'ераў выкарыстаны тынкоўка з каменнай і мармуровай крошкай. Тарцовая сцяна аперацыйнай залы была аформлена шматфігурным гіпсавым рэльефам на тэму працы (скульпт. В. Даненкаў), лесвіца ўпрыгожана чаканкай (архіт. А. Волкаў).

**Маркса № 34 — Дом Шэгідзевіча, дом Шошы Браўна**. Год пабудовы — 1880. На 1946 г. – Гродзенская сплаўная кантора.

**Маркса № 38 — Дом Шэрэшэўскага (на 1928 г. – гаспадыня Эстэра Шэрэшэўская)**. Пабудаваны на пачатку XX ст. У 1945 г. – крама № 12 “Горпищепромторга”.

## Маставая

**Маставая № 31 — Тытунёвая фабрыка Шарашэўскага, тытунёвая фабрыка “I.L. Szereszewski TOW. AKC.», Hurtownia Monopolu Tytoniowego, пальчатачная фабрыка.** З 1947 г. будынак фабрыкі выкарыстоўваецца Гродзенскім тонкасуконным камбінатам (Ён быў адным з нешматлікіх пабудоў, ацалелых у раёне сёняшняй Савецкай плошчы). У пачатку 1960-х камбінат перасяліўся ў новыя карпуся, а перад уладамі ўстала пытанне, якое пырстасаванне знайсці будынку ў цэнтры горада. 30 жніўня 1961 г. выканкам прымае рашэнне абавязаць Аблпраект і дырэкцыю тонкасуконнага камбіната прадаставіць гарвыканкаму прапановы па рэканструкцыі гэтага будынка пад жыльё. У верасні 1964 г. была прынята пастанова аб рэканструкцыі будынка пад жыльё з дабудодвай двух паверхаў і размяшчэннем харчовых і гаспадарчых крамаў на першым паверсе. Аднак, пасля адкрыцця ў горадзе фабрыкі пальчаткавых вырабаў вытворчы комплек камбіната перадалі ёй пад рэканструкцыю.

**Маставая № 35 — Будынак абласнога драматычнага тэатра**. Пабудаваны ў 1977-1984 гг. з цэглы і зборнага жалезабетону. Архітэктары Г. Мачульскі ды А. Пархута. Цэнтральны ўваход вылучаны пластычна выгнутымі сценкамі і каскадам лесвіц. Над ім размешчана трохфігурная кампазіцыя «Пегас» - скульптар Л. Зільбер (медзь, выкалатка, вышыня 8 м). Будынак драматычнага тэатра — твор сучаснай савецкай архітэктуры .

**Маставая № 39 — Палац Мараўскіх, казармы батарэі ўнутраннай сувязі (на 1865 г.), губернскія мураўёскія казармы гродзенскага крэпаснога батальёна, казармы пермскага і петразаводскага палкоў, казармы 171-га кобрынскага пяхотнага палка, мураўскія казармы (на 1907 г.), галоўная гаўптвахта ды перасылачнае аддзяленне (?), махорачная фабрыка Іоселя Лейбавіча Шарашэўскага і Файвеля Шэбшэлевіча Русоты, Machoczarnia, "жоўтыя" казармы, гарадскія казармы, казённыя казармы, корпус тонкасуконнага камбіната.** Год пабудовы — 1850 (па іншых звестках – 1867 г.). Архітэктар Фардон. На 1947 г. – школа ФЗО № 7. З пачатку 1950-х гг. - гродзенскі тонкасуконны камбінат.

**"Стары" мост, Петровско-Николаевский** мост, мост імя Пілсудскага - Быў адчынены 6 жніўня 1909 г.

Мост імя Пілсудскага стаўся месцам зацятых баёў у верасні 1939 г. савецкіх і польскіх войскаў [*гл. – вул. Гарнавых*]: Раніцай 20 верасня савецкія войска - разведбатальён 27-й танкавай брыгады маёра Багданава ў складзе адзінаццаці танкаў, бронемашыны і радыястанцыі, рухаючыся з боку Беластока зусім нечакана падыйшоў да левабярэжнай часткі горада. Адсутнасць супраціўлення з боку палякаў падштурхнула савецкае камандаванне паспрабаваць заняць горад з марша.

"...Ранкам на мост выехаў гіганскі танк, - Узгадвала пазней Гражына Ліпінска, сведка гэтых падзей. – Ён зусім лёгка прарваўся праз нашы запоры; за ім з'явіўся другі, трэці, чацьвёрты... Трымцяць на ніх чырвоныя сцяжкі. На першым танкі букет кветак, дзесьці павіталі яго кветкамі, дзесьці, але не ў Гродна...". Аднак амаль адразу пасля таго, як танкі па мосце пераправіліся ў цэнтр Гродна, яны апынуліся раз'днанымі агнём праціўніка і да таго ж пазбаўленным прыкрыцця з боку пяхоты.

Адступаючы 23 чэрвеня 1941 г. савецкія войскі зноў пашкодзілі яго, аднак нямецкія саперныя часткі худка аднавілі рух. У 1944 г. мост быў узарваны немцамі і адноўлены толькі ў 1949 годзе. У лістападзе 1950 г. на масту былі усталяваны мемарыяльныя знакі, зробленыя на Гродзенскай ліцейна-механічным заодзе (Знішчаны пад час рэканструкцыі маста ў 2008 г.).

## Міру

**Міру № 15 — Школа № 15.** Рашэннем Гарвыканкама ад 17 красавіка 1968 г. сярэдняй школе № 15 было нададзена імя Д.Карбышава.

**Помнік Д. Карбышаву. -** Пастаўлены ў 1975 г. перад будынкам сярэдняй школы № 15. Скульптар А. Салятыцкі.

# П

**Паповіча**

**“Новы” мост** – рашэнне аб будаўніцтве моста было прынята ў другой палове 1960-х. у раёне правядзення ў тыя часы знакамітых на ўвесь горад мотагонак. Будаўніцтва вялося Брэсцкім мостацягнікам № 811 (пазней “Мостаатрад-58”). Уведзены ў эксплуатацыю ў 1971 г., а злучаны берагі былі ў пачатку восені 1970 г. Паколькі мост доўна не меў афіццыйнай назвы, гродзенцы замацавалі за ім назвы “Новы мост”. Правы бераг Нёмана (вуліца Рыбацкая), дасюль не мае асфальтавага пактыцця, якое даходзіла бы да Новага моста.

**Яўрэйскія могілкі** — Адзіныя ацалелыя яўрэйскія могілкі ў горадзе. Могілкі былі зачынены Савецкай уладай у 1968 годзе.

**Помнік савецкім памежнікам** – Бронзавая кампазіцыя пад назвай “Граніца ў агні”, прысвечаная 19-ці тысячам воінаў Беларускай пагранічнай акругі. Адчынены 22 чэрвеня 2004 г. Аўтары – скульптар Г. Буралкін, архітэктар С. Федчанка.

Складаецца з трох частак. Між дзьвух аб'ёмаў пагранічных слупоў, якіх усяго пятнаццаць – па колькасці савецкіх рэспублік у складзе СССР, прыняўшых удзел у вайне, знаходзіцца дынамічная і сімвалічная група воінаў, якія нібы закрываюць пралом сваімі целамі. Фігур тры: баец, камандзір ды палітработнік.

**Паповіча № 3 — Кінатэатр «Кастрычнік».** Год пабудовы — 1987. Індывідуальны праект У. Еўдакімава, Л. Вільчко і У Шапавалава.

**Парк Жылібера // гарадскі батанічны сад.**

*Бярэ пачатак ад парку часоў А. Тызенгаўза вясной 1776 г., калі ў Гродна быў запрошаны французскі прафесар медыцыны, батанік і анатам Жан Эмануэль Жылібер.*

*У канцы Другой сусветнай вайны тэрыторыя былога школьнага батанічнага саду была выкарыстана пад могілкі для савецкага палявога ваеннага шпіталя. Было захавана каля тысячы савецкіх салдат. Пазней іх перазахавалі ў адной брацкай магіле паблізу Гараднічанкі.*

*У 1950-я гады вакол парку была зроблена агароджа з кованых эклектычных бардзюр, дэмантаваных з разбуранага моста над Нёманам. Тады ж з боку вул. Дзяржынскага быў пастаўлены помнік Сталіну-Леніну. У 1948 г. кошт уваходнага квітка ў парк складаў 1 руб, у 1956 г. - 50 кап.З 1 мая 1957 г. па рашенні гарадскіх уладаў быў усталяваны свабодны (бясплатны) уваход у гарадскі парк, адкрытая частка парка (сквер) была перададзена ў ведзенне гарпарка.*

*У 1951 г. на базе былога біялагічнага саду Я. Каханоўскага адчыняецца абласная станцыя юных натуралістаў. Першым яе кіраўніком стаў Н. Жаваранкоў. Для яе працы выкарыстоўвалі ў тым ліку захаваную з 1920-х гадоў аранжарэю-«памаранчарню». У 1953 г. станцыя перанесена на вул. Камунальную, але аранжарэя заставалася яе філіялам яшчэ да канца 1950-х гадоў. У веарасні 1957 г. аранжарэя была перададзена парку дзеля вырошчывання кветкаў на ўласную патрэбу. Пазней усе расліны, уключаючы пробкавае дрэва часоў Жылібера, былі знішчаны, а на іх месцы пабудавана некалькі каруселяў.*

*Вясной 1964 г. парк пазбавіўся некалькі сваіх упрыгодванняў: скульптурныя кампазіцы і “Гусі” са старога фантана ды “Мядзьведзі” з былой закрытай часткі парка былі перададзены дзецкім садкам. Першапачаткова ў фантане размясцілі чашу, якую пазней замянілі на перанесяную з былой зачыненай часткі парка скульптуру “Мацярынства”...*

*1 красавіка 1957 г. у гарадскім парку быў адчынены кінатэатр, які атрымаў назву “Летний”. У другой палове 1990-х ён быў перапрафіліраваны пад маладзёвы клуб “Клетка”. У 2005 г. пад час рэканструкцыі парка былы кінатэатр быў знесены. Тады ж быў знесены і драўляны павільён «Лакамка» на ўваходзе ў парк з боку плошчы Леніна.*

*Рашэннем гарвыканкама ад 15 верасня 1989 г. парку было нададзена імя прафесара Ж. Жылібера. У маі 1991 г. Саўмін БССР зацвердзіў пастанову аб усталяванні бюста навукоўцу аднак гэтае рашэнне не было выканана. ася ў 2005 г., аднак ужо ў 2006 г. напярэдадні чарговага свята тут быў знесены.*

**Брацкая магіла савецкіх воінаў і партызан** - У парку. Пахаваны 46 воінаў і 4 партызаны, якія загінулі ў Вялікую Айчынную вайну. Сярод пахаваных — Героі Савецкага Саюза Юрый Іўліеў (1923-1945), Вольга Санфірава (1917-1944) і сакратар Гродзенскага падпольнага гаркома ЛКСМБ Вольга Соламава (1920-1944). У 1949 г. на брацкай магіле пастаўлены помнік — скульптура воіна са сцягам і абеліск. У 1984 г. магіла добраўпарадкавана, запалены Вечны агонь.

**Парк Каложскі // парк імя "40-летия ВЛКСМ"** - *У верасні 1962 г. Гарвыканкам прыняў рашэння "О проектировании центрального парка культуры и отдыха имени 40 лет БССР». Рашэннем выканкама ў красавіку 1964 г. парку было нададзена назва"Космос".*

**Помнік у гонар 850-годдзя Гродна** — Усталяваны ў 1978 г. да 850-годдзя першага згадвання Гродна ў Іпацьеўскім летапісе пад 1128 г. Скульптар Г. Буралкін, архітэктары А. Каралькоў, Г. Пешкаў. Прадстаўляе сабой дзьве стэлы вышынёй у 31 м., якія аб'яднаны ўверсе блокам-вітражом з выявай лічбы "850" (каляровае шкло, хрусталь).

Каля асновы слупоў з заходняга і ўсходняга бакоў у нішах устаноўлены дзве скульптуры вышынёй 6 м пад назвамі "Воін" ды "Гасціннасць". Першая фігура выяўляе воіна-латніка, другая – жанчыну з рушніком у руках.

Да помніка вядзе шырокая алея, якая пачынаецца вялікім валуном, на плоскасці якога выбіта "850-годдзе".

### Парыжскай камуны

**Парыжскай камуны № 3** - Рашэннем Гарвыканкама ад 23 чэрвеня 1955 г. зноўпабудаваная школа атрымала № 1.

**Помнік настаўнікам і вучням** — Аўтар А. Салятыцкі. Пастаўлена перад будынкам сярэдняй школы № 1 ў 1981 г. на ўшанаванне памяці настаўнікаў і вучняў, якія загінулі ў Вялікую Айчынную вайну. Прадстаўляе сабой стылізаваны сшытак, на фоне якога выбіты дзьве галавы – жаночая ды дзіцячая. У нізе стэлы надпіс па расейску: "Памяти учителей и учеников павших в годы Великой Оиечественной войны 1941 – 1945".

### Перамогі

**Вайсковыя могілкі** — Пахаваны савецкія воіны, якія загінулі ў 1939 г. — Р. Гарнавых, Ф. Квітко, брацкая магіла чырвонаармейцаў з верасня 1939 г. У 1940 г. на магіле пастаўлены абеліск.

## С

**Савецкая** — *Моцна пацярпела пад час вайны. У 1960-1970-я гады вуліца Савецкая страціла вялікую колькасць дамоў і дваровых флігеляў, некаторыя фасады былі непазнавальна зменены.*

**Савецкая № 1 — «Дом мейскі гасцінны», Мураваная гарадская карчма, камяніца Зеляпугі (Зеленугі?), палац князёў Сангушкаў, гродзенскі кадзецкі корпус, аптэка па Дамініканскай, дом Кацэнэленбогена, дом Левінсона, фотамайстэрня Л. Гельгора, крама «Цацкі», крама «Ратушная».** Пабудаваны ў XVI ст.— 1742 г. Неаднаразова

перабудоўваўся. У 1945 г. тут адчынілася крама № 25 "Горпищепромторга". Рашэннем выканкама Гарсавета ў Гродна ў чэрвені 1947 г. адчынілася ўніверсальная прамтаварная крама "Главособунивермаг", якой былі перададзены две крамы: № 25 "Горпищепромторга" на вуглу вуліцы Савецкай ды Савецкай плошчы з "...прилегающим к нему пивным ларьком Треста столовых и ресторанов и чайной Военторга" ды недабудаванай крамаю " Горпищепромторга" па вуліцы Савецкай № 29. У лістападзе 1962 г. на першым паверсе гэтага дома адчынілася дыетычная сталоўка. У 1972 г. у будынку працавала цырульня № 2 гарбыткамбіната. Па стану на 1982 г. – крама "Союзпечать".

**Савецкая № 3 — Дом Тарлоўскага**. Год пабудовы — 1880-1914.

У кастрычніку 1944 г. абутковая і кравецкая майстэрні на першым паверсе былі выселены на вул. Акадэмічную № 2, а замест іх памяшканне заняла кантора "Военторга". У канцы мая 1945 г. тут быў адчынены «пункт для скупки у населения предметов широкого потреблениyи домашнего обихода с немедленной оплатой наличными деньгами». У верасні 1945 г. "Военторгу" было прапанавана вызваліць два пакоі, якія займалі майстэрні па рамонту друкарак і веласіпедаў, "...для организации «Американки» артели «Красная звезда»". У 1964 г. у доме працавала фотаатэлье № 4 "Горбыткомбината", затым - гарнізонны ўнівермаг. Пасля переезда універмага ў 1966 г. в новы будынак па проспекту Касманаўтаў, тут адкрылася крама аблкнігагандлю «Ученика и учителя». У мае 1968 г. было прынята рашэнне пра арганізацыю крамы магазина «Белювелирторга» па продажу тавараў за валюту.

**Савецкая № 4 — Будынак Аблсаўпрофа.** Пабудаваны ў 1950-я гады. Прыклад «сталінскага ампіра», які сваёй аддаленасцю ад гістарычнай восі вуліцы, разбівае яе на самым выйсці з колішняга Рынку.

**Савецкая № 6 — гродзенскі Дамініканскі кляштар, дамініканская школа, гродзенская дамініканская гімназія, гродзенская губернская мужчынская гімназія, мужчынская класічная гімназія імя генерала Тормасава (?), настаўніцкая семінарыя Польскай мацежы школьнай, двухклассная народная школа для дзяцей фольксдойчэ, аднакласная народная школа для райхсдойчэ** (1943 г.)**.** Узведзены ў 1735 г. з цэглы айцом Т. Ганусевічам замест існаваўшага раней драўлянага. Архітэктар – Л. Грынцэвіч. У 1760-я гады будынак дабудаваны ўздоўж вуліцы.

Па стану на 1954 г. у будынку працаваў калбасны цэх мясакамбіната. Зараз – жылыя памяшканні. Праект рэканструкцыі будынка знаходзіцца ў распрацоўцы.

На пачатак ХХ ст. за гімназіяй знаходзіліся адрамантаваныя мураваныя дамы з амбарам і стайняй на падворку купца Ізраэля Закгэйма з крамай Каплана, новай банкаўскай канторай Гурвіч і магазінам гаспадара.

**Савецкая № 7 — Дом Фукса, магчыма, дом Допельберга, дом Хозе (з 1915 г.)**. У верасні 1944 г. будынак і два флігеля былі перададзены "Управлению строительно-восстановительнвх работ" Беластоцкай чугункі. У канцы 1940-х – пачатку 1950-х гадоў на першым паверсе працавала сталоўка рамесленага вучылішча № 14, а з 1 жніўня 1952 г. – адчынена дыетычная сталоўка. З 1960-х гадоў тут працуе крама "Оптика".

У гістарычным плане будынак цікавы яшчэ і тым, што, па сутнасці, акрэслівае паўночную мяжу былой юрыздыкі Александровічаў.

**Савецкая № 8 — Новая дамініканская школа, жаночы пансіён, гарадское паліцэйскае ўпраўленне ды арыштанская (1895 г.), сіроцкі суд, канцылярыя прыстава 1-й часткі (на 1915 г.), гарадская ўправа, гарадское паліцэйскае ўпраўленне, Магістрат**. З 1945 г. у будынку працавала рэдакцыя газеты "Гродненская правда", армейскай газеты "Красное знамя" і чыгуначнай газеты "Западная магистраль". З красавіка 1947 г. – газетны цэх гродзенскай друкарні. З 1948 г. – партыйны кабінет. 10 чэрвеня 1949 г. парткабінет пераехаў на вул. Дзяржынскага №1, а памяшканні былі перададзены абласному аддзяленню мастацтв для размяшчэння абласнога Дома народнай творчасці, Дзяржаўнага ансамбля песні і танца ды дзіцячага тэатра лялек. Пасля высялення ў лістападзе 1953 г. рэдакцыі вайсковых газет, частка будынка апынулася ў ведзенні Дома афіцэраў для размяшчэння вячэрняй школы. Па стану на 1970 г. – гарадскі вайсковы камісарыят.

**Помнік маршалу В. Сакалоўскаму** (1897-1968) — Пастаўлены ў 1973 г. Скульптар — Г. Мурамцаў, архітэктар — В. Аладаў.

На гэтым месцы на пачатку 1950-х стаяў помнік Сталіну, які па мясцовай легендзе быў пазней закапаны тут жа ў зямлю.

**Савецкая № 9 — Кінатэатр «Гродна», філармонія.** Год пабудовы — 1961. Будынак перакрыў сабой вуліцу Калючынскую. Адначасова пры пабудове былі наўмысна зруйнаваны камяніцы пры вуліцы Савецкай.

**Савецкая № 10 — Палац Сапегаў па Дамініканскай, дом Саламона Лапіна, дом Хвелевіцкай, рэдакцыя газеты "Пагоня", Ленінскі райвыканкам.** Год пабудовы— 1795.

На верасень 1944 г. другі паверх будынка займалі партыйные ды педагагічныя кабінеты. У студзені 1945 г. адкрылася майстэрня па заліўцы галошаў ды вулканізацыі скатаў і шын. У сакавіке 1945 г. памяшкані на першым паверсе былі пераробленыя пад пякарню па выпечцы кандзіцерскіх вырабаў. У канцы 1945 г. тут, так сама, адчынілася кравецкая майстэрня. У сакавіку 1946 г. Гарпрамкамбінат адкрыў мастацка-афарміцельную майстэрню. У 1947 г. – швейная майстэрня "Горпромкомбината". У 1970 г. – салон мод швейнай фабрыкі індпашыву адзення і крама "Политическая книга". 5 сакавіка 1970 г., у выніку абвала даха пад вагою снега над кніжнай крамай, дом быў аддадзены пад капітальны рамонт і пераробленыя для гарсавета. У 1970-х г.г. тут, так сама, размяшчалася крама "Ткани". На пачатак 1990-я г.г. працавала рэдакцыя газеты "Пагоня".

**Савецкая № 12 — Дом купцоў Франкаў, публічная бібліятэка ( на 1903 г. ), магазін Жураўскага.** Год пабудовы — 1900.

15 верасня 1944 г. першы паверх будынка быў перададзены мясцоваму бровару пад піўную краму. На 1946 г. тут знаходзілася гродзенская абласная кантора "Союзутиль". У красавіку 1962 г. арачны праезд, які знаходзіўся справа ад увахода, быў перададзены краме № 7 і рэканструяваны пад гандлёвае памяшканне. На 1970 г. працавала крама каапгандлю "Журавинка".

**Савецкая № 13 — Дом Шаі Пік.** Пабудаваны паміж 1811 і 1831 г.г.. Перабудаваны ў 1900 г. У жніўні 1944 г. на першым паверсе былі адчынены крама № 2, абутковая і швейная майстэрні. Частка памяшканняў дома № 13 была перададзена пад рабочы клуб "Управления строительно-восстановительных работ" Беластоцкай чугункі. У сакавіку 1946 г. на першым паверсе адчынілася камерцыйная хлебная крама. У 1956 г. тут працавала крама "Одежда". Рашэннем Гарвыканкама ў красавіку 1968 г. памяшканні, якія займала інспекцыя "Госстраха" былі перададзены фабрыкі па рамонту абутка і хімчысцы пад майстэрню бытавога абслугования насельніцтва.

**Савецкая № 14 — Касцёл і шпіталь Св. Духа, дом А. Тарлоўскага, дом Допельберга, дом Хозе, "скоропечатная" Соры Ган ( на 1910 г. ), гатэль «Славянский» Хашы (Хошы) Фрухт, гатэль "Гандлёвы", нямецкі вайсковы пансіянат «Стары сябра», Ленінскі райвыканкам.** Быў пабудаваны на фундуш каралевы Боны ад 9 кастрычніка 1551 г. Пасля 1944 г. будынак займаў абласны камітэт кампартыі Беларусі, які пазней пераехаў у Новы замак. Са снежня 1952 г. тут размесціўся Гродзенскі выканкам. Па стану на 1970 г. шэраг памяшканняў займала Бюро тэхнічнай інвентарызацыі.

**Савецкая № 15 — Дом Левандоўскага.** Пабудаваны ў 1875 – 1885 г.г.. У верасні 1944 г. на другім паверсе будынка размясцілася кантора хлебкамбіната. На 1970 г. – Бюро бытавых паслуг, крама "Галантерея", абласная кантора адвакатаў.

**Савецкая № 17 — Гатэль «Расія». Дом Хона Піка ( на 1928 ).** Год пабудовы — 1811. У 1945 г. тут адчынілася кантора гродзенскага "горпищепромторга". У 1950 г. – кантора "Белкнижкультторга". На 1960 г. – крама № 32 "Галантерея", затым у 1961 г. – крама "Подарки". Па стану на 1961 г. – паліклініка УУС. З 1974 г. – юрыдычная кансультацыя. На 1982 г. – крама "Гражина".

**Савецкая № 17а** — Год пабудовы — 1895. Тыповы флігель у стылі эклектыкі. У 1945 г. на першым і другім паверсе працавалі фотаатэлье і філіял "Союза советских художников БССР". На трэцім паверсе – "Управление по делам сельского и колхозного строительства"

пры аблвыканкаме. У 1964 г. – крама “Подарки” Горпрамгандлю. У тым жа годзе на першым паверсе дома № 19 былі вызвалены два памяшканні з мэтаю расшырэння гандлёвых плошчаў для гэтай жа крамы.

**Савецкая № 18 — Гандлёвы дом «Неман» — універмаг.** Складаецца з дзвюх частак: «сталінскага ампіру» 1950-х гадоў і будынка 1970-х гадоў. Пры пабудове ўнівермага быў зруйнаваны шэраг камяніц, якія складалі неад'емную частку архітэктанічнага комплексу гістарычнай забудовы вул. Савецкай.

Старэйшая частка ўнівермага пабудавана на месцы дома Л.Валянскага (?), дзе знаходзіўся гатэль «Европа» - “Большой Европейский”, разбуранага ў пачатку 1950-х гг. Гэты гатэль (самы лепшы ў горадзе), быў закладзены яшчэ Меерам і Сімай Капланамі, якія, пацярпеўшы пад час пажара 1885 г., вымушаны былі прадаць гатэль Людвіку Мар’яну Баркоўскаму, які ў сваю чаргу ў 1912 г. прадаў яго шляхцянцы Луізе Ваўкавыцкай (у міжваенныя гады гатэлем валодала Людвіка Ваўкавыцкая. На 1915 г. узгадваецца гатэль «Большой Европейский» у доме Л.Валянскага ).

Багата дэкараваны разнастайнымі архітэктурнымі элементамі, з вялікай колькасцю чугунных балконаў, гатэль “Еўропа” быў шэдэўрам гродзенскай эклектычнай архітэктуры. Матывы разбурэння гатэля да сённяшняга дня ня ясныя. Будынак не пацярпеў у гады Другой Сусветнай вайны, аб чым сведчаць фотаздымкі і ў 1947 годзе быў нават складзены праект яго аднаўлення. 19 сакавіка 1959 г. дзяржаўная камісія прыняла да эксплуатацыі будынак універмага на шесцьдзесят месцаў. 29 верасня 1969 г. гарвыканкам прыняў рашэнне: “Отвести земельный участок Гродненскому Универмагу под расширение производственного здания по улице Советской со сносом кинотеатра «Спартак», подсобного здания мединститута, с перспективным сносом гостиницы «Беларусь» и других зданий”.

**Савецкая № 19 — Дваранскі дэпутацкі сход, дом Фіна, дом Х. Шмігельскай.** Год пабудовы — 1848. У жніўні 1944 г. адчынілася крама № 1. У лютым 1952 г. рашэннем гарвыканкама былі адчынены салон-крама і ізастудыя “Союза советских художников БССР”.

**Савецкая № 20 — Гатэль «Камерцыйны», «Гандлёвы», кавярня Юзэфа Катоўскага, кавярня Алтера Хазана, рэстаран «Беласток».** Год пабудовы —1900.

У 1950 г. – абласны савет “Осоавиахим”. Рашэннем выканкама гарсавета ў жніўні 1951 г. рэстаран “Белоруссия” на першым паверсе быў зачынены, а замест яго пачала працаваць узорная сталоўка. У 1953 г. – трэст сталовых і рэстаранаў. Рашэннем гарвыканкама 11 верасня 1953 г. гатэль № 2, які знаходзіўся у гэтым будынку, атрымаў назву “Белоруссия” (праўда, да снежня 1969 г. ён насіў назву «Беларусь»). Са 29 снежня – гатэль «Гродно». У 1964 г. тут адчынілася кафэ (з лістапада 1974 г. - рэстаран «Белосток»). З гэтага часу ў рэстаране на прафесійнай аснове выступалі творчыя калектывы, установа карысталася вялікай папулярнасцю. Пасля закрыцця будынка на рэканструкцыю (якая цягнецца ўжо дваццаць год), назва “Беласток” перайшла да рэстарана “Гродна” на скрыжаванні вуліц Тэльмана і Гараднічанскай. З лістапада 1974 г. - рэстаран «Белосток».

**Савецкая № 21 — Дом купца Чартка.** Пабудованы каля 1866 г.. На 1950 г. – областная бібліатэка. На 1970 г. – ювелірная крама, затым - крама “Жемчужина”.

**Савецкая № 23 — Дом Ромера.** Год пабудовы — 1856.

У другой палове 1940-х тут месціўся інтэрнат Гродзенскага педагагічнага інстытута, у ім у гэты час жыў будучы знакаміты гродзенскі пісьменнік Аляксей Карпюк. Тут жа ў той самы час дзейнічала падпольная беларуская антысавецкая арганізацыя, разгромленая НКУС у канцы 1940-х гг. З ліпеня 1947 г. у будынак перасяліўся апарат гродзенскага гарвыканкама са ўсімі аддзеламі. У 1961 г. на цокальным паверсе адчынілася “Пельменная”. Па стану на 1970 г. – “Облмежколхозпроект” ды “Облмежколхозстрой”. На 1982 г. – обласная арганізацыя таварыства аматараў кнігі.

**Савецкая № 25 — Дом Ратнера**. Год пабудовы — 1870.

У 1940 - 1941 г.г. - мастацткае фота № 2 Ваенгандля. Зноў адчынілася ўжо пасля вайны ў верасні 1945 г. На 1950 г. – кантора “Заготлен”. У 1952 г. – фірмовая крама па продажу папірос ды тытуня “Белтабаксбыт”. З 1964 г. – крама “Спорттовары” гродзенскага

ўнівермага. У 1971 г. адчынілася крама “Березка” па продажу тавараў за валюту для іншаземцаў. На 1982 г. – крама “Букинист”.

**Савецкая № 27 — Дом Салавейчыка**. Год пабудовы — 1870.

У 1970 г. – абласная дзіцячая бібліятэка. На першым паверсе – крама полуфабрыкатаў.

**Савецкая № 29 – Універмаг “Детский мир”.** Пабудаваны у 1982 г.

**Савецкая плошча** — *Пасля вызвалення горада ў ліпені 1944 г. плошча была суцэльнымі руінамі. Разбор завалаў цягнуўся некалькі год. Выканкам гарадскога савета была пастаўлена задача канторы добраўпарадкавання да 25 сакавіка 1949 г. скончыць пракладку вузкакалейкі на Савецкай плошчы для расчысткі завалаў, а таксама падрыхтаваць ваганеткі, распрацаваць працоўныя графікі і прыступіць да выканання прац.*

*Да канца 1940-х г. руіны былі разабраныя, пры тым апошнімі ў 1949 г. былі разабраны сцены ратушы, трба сказаць, добра захаванай у гады вайны.*

*Перад уладамі паўстала задача забудовы вялізарнай прасторы у цэнтры горада. У студзені 1946 г. гарвыканкам разглядае пытанне “Аб генеральнай схеме планіроўкі горада Гродна” і прыймае рашэнне “распрацаваныя тэхнічна-эканамічныя перспектывы аднаўлення і развіцця Гродне і схему генеральнай планіроўкі горада Гродна зацвердзіць”. Цягам 1946-1946 гг. архітэктары гродзенскага філіяла “Белдзяржпраекта” займаюцца распрацоўкай першага генеральнага плана рэканструкцыі і развіцця Гродна.*

*На адным з сваіх паседжанняў у ліпені 1947 г. гарвыканкам вырашае, што “важнейшай палітычнай задачай яўляецца аднаўленне да 15 жніўня 1947 г. скульптуры Леніна на плошчы Леніна і скульптуры Сталіна на плошчы Савецкай, якія былі пастаўлены ў 1940 г. і разбураны нямецка-фашысцікмі захопнікамі”.*

*Генплан рэканструцкцыі і развіцця горада адобраны і зацверджаны на паседжанні Гродзенскага аблвыканкама ў красавіку 1949 г., і ў лютым 1951 г. Саветам Міністраў БССР. Па генплану цэнтар горада планавалася стварыць на правым беразе Нёмана ў старажытнай частцы горада, пры злучэнні галоўных радыяльных магістраляў: Савецкага праспекта, уліц К. Маркса, Замкавай, Мастаавой і Савецкай плошчы. Гэтая плошча павінна пераўтварыца ў цэнтральную плошчу горада, якую архітэктары планавалі ўпрыгожыць новымі архітэктурнымі дамінантамі. Так на месцы сквера паміж Фарай Вітаўта і Фарным касцёлам планавалася збудаваць пампезны Дом Саветаў. На куце Саевцкай плошчы і вул. Замкавай, дзе зараз стаіць палац Тэкстыльшчыкаў, было запраектавана будаўніцтва Дома прафсаюзаў. Магістраль “Сікдзельскі тракт – праспект К. Маркса” далей павінна была прайсці па найкарацейшаум шляхупраз Савецкую плошчу, рэчку Гараднічанка да новага Цэнтральнага парку (цяпер Каложскага) і будучага стадыёна. Ад цэнтральнай плошчы да берага ракі Нёман ствараецца бульвар, упрыгожаны фантанамі і скульптурамі.*

*У снежні 1955 г. па рашэнні гарвыканкама на заканчэнне добраўпарадкавання Савецкай плошчы было выдзелена 221 600 рублёў, а на будаўніцтва помніка Сталіна на той самай плошчы – 150 000 рублёў.*

*Планы архітэктараў 1940-50-х гг. былі рэалізаваны толькі часткова, а да пачатку 1960-х гг. генеральны план страціў сваю актуальнасць, і гарадскія ўлады сталі ўносіць у яго карэктывы. Упершыню да карэктыроўкі плана выканкам звярнуўся 25 мая 1960 г. Да пачатку 1960-х гадоў Савецкая плошча была практычна адзінай у горадзе, якая мела асфальтавае пакрыццё – 6 кастрычніка 1959 г. дзяржакамісія прыняла асфальтаванне плошчы.*

*На вуліцы Крупскай справа ад дома “Одежда” у снежні 1961 г. была здадзена ў эксплуатацыю гасцініца “Нёман” з аднайменным рэтаранай. На першым паверсе дома на куце Савецкай плошчы і вуліцы Парыжскай камуны знаходзіўся хіба самы лепшы гастраном таго часу – “Цэнтральны”. Дом з крамай быў здадзены ў 1958 г.*

*Цягам 1960-х гг. на плошчы паўсталі некаторыя новабуды. 30 кастрычніка 1963 г. прыняты дзяржкамісіяй падземны туалет на Савецкай плошчы. 19 лістапада 1964 г.*

*дзяржакаміся прыняла вуглавы дом з аптэкай, які прымыкае да пальчаткавай фабрыкі. Яшчэ раней была сканструявана Дошка гонару (разбурана ў 2006 г. пад час рканструкцыі).*

*Генплан 1973 г. ўжо не прадугледжваў, так ягоныя папярэднікі, амаль поўнга знішчэння гістарычнай забудовы горада, аднак у большасці таксама так і застаўся нерэалізаваным. XXI стагоддзе Савецкая плошча сустрэла ў выглядзе, які набыла на працягу 1960-х гг.*

**Савецкая плошча № 1 — Палац культуры Тэкстыльшчыкаў**. Пабудаваны па тыпавым праекце (архітэктар — І. Рожын) з выкарыстаннем элементаў класіцызму. Прыклад архітэктуры 1940-1950-х гг.

Рашэнне а будоўлі палаца культуры было прынята гарвыканкамам 6 лютага 1953 г.: “Отвести Гродненскому тонкосуконному комбинату земельный участок по улице Мостовой, угол улицы Замковой, площадью согласно существующих нормативов, для строительства клуба со зрительным залом на 420-550 мест”. 22 кастрычніка 1959 г. быў падпісаны акт прыёмкі будынка дзяржкамісіяй. Сярод гарадзенцаў існуе легенда, быццам бы палац пабудавалі “задам на перад”, г.зн. што фасад, які выходзіць на “Дом быта” на сам рэч – галоўны і павінен “глядзець” на саму плошчу.

У 1970 г. на будынку Палаца культуры тэкстылыпчыкаў у памяць аб рэвалюцыйных падзеях 1921-1939 г.г. устаноўлена мемарыяльная дошка.

**Савецкая плошча № 2 — Дом купца Мураўёва, biblioteka miejska, абласная бібліятэка імя Я. Карскага**. У красавіку 1945 г. працавала гродзенская фабрыка індпашыва “Ателье мод”. У студзені 1951 г. памяшканні, якія займала фабрыка, былі перададзены ў ведзенне гарадской (пазней – абласная імя Я. Карскага) бібліятэкі, якая працавала тут аж да пачатку 1990-х гг.

**Савецкіх памежнікаў**

**Савецкіх памежнікаў № 53 – Кінатэатр А.С. Пушкина, клуб “Пушкин”**. Згодна з генеральным планам вастанаўлення і рэканструкцыі Гродна ў занеманскай часцы горада на адной з магістральных вуліц было запланавана будаўніцтва кінатэатра на трыста месцаў. Аднак, у сувязі з абмежаванасцью ў сродках, гарвыканкам вырашыў абмяжавацца будаўніцтвам кінатэатра раённага тыпа на сто пасадачных месцаў меньш. У сувязі з адсутнасцью гарадскога тыпавога праекта на двесці месцаў, 4 красавіка 1950 г. выканкам прыймае да будаўніцтва праект для раённых цэнтраў архітэктара Калмыкова. Першапачаткова, кінатэатр павінен быў знаходзіцца на вуглу вулі Беластоцкай і Аўгустоўскай ( сёняшніх – Суворава і Курбатава ) побач з хлебакамбінатам. Аднак, усяго праз тры дні пасля прыняцця рашэння, пад будоўлю быў адведзяны новы вучастак плошчай 3300 кв. метроаў па вул. Ласасянскай (Советских пограничников). 31 снежня 1954 г. дзяржкамісія прыняла да эксплуатацыі будынак кінатэатра на 218 месцаў, якому 7 студзеня наступнага года рашэннем гарвыканкама было нададзена назва “имени А.С. Пушкина”. 10 жніўня 1955 г. гарвыканкам прыняў рашэнне № 328, згодна якому кінатэатр павінен быў памяняць сваю назву на кінатэатр “Неман”. Звестак пра тое, калі было вернута першапачатковая назва не захавалася.

**Сацыялістычная**

**Сацыялістычная № 4 — Кінатэатр Манастырскага “Эдэн”, «Eden», “Palac”, “Polonija” (Tow. Kinowe “BLOK”), “Pan”, "Красная звезда" (з 1940 г).** Пабудаваны, хутчэй за ўсё, у 1915 г. Пасля Другой Сусветнай вайны кінатэатр быў зноў адчынены рашэннем

гарвыканкама ад 12 верасня 1944 г.. Пазней - летам 1961 г., пры ім пачаў працаваць передвіжны дзіцячы кінатэатр “Малютка” на базе аўтобуса “ЗИЛ”.

**Сацыялістычная № 12** — Год пабудовы — 1879. У 1956 г. арцель “Прогресс” адчыніла на першым паверсе дома майстэрню па рамонце музычных інструментаў. У 1960 г. – клуб горбыткамбіната.

**Сацыялістычная № 17 — Дом Ашкеназі.** Год пабудовы — 1900.

На 1950 г. – сярэдняя школа №8 ды вячэрняя школа №1. На 1957 г. СШ № 8 займала памяшканні ў домах №17 і №17а. У верасні 1962 г. яна пераехала ў новы будынак па вул. Чапаева (зараз - Васілька), пасля чаго былы гатэль поўнасцью перайшоў пад вячэрнюю школу працоўнай моладзі №1.

**Сацыялістычная № 22 — Гродзенская тэлефонна-тэлеграфная станцыя.** Пабудавана ў 1910 г. па праекце архітэктара Небальсіна. На 1970 г. – гарадское аддзяленне міліцыі. Пазней Кастычніцкае РАУС Гродна.

**Сацыялістычная № 37 — Дом Шлёмы Швейцара**. Год пабудовы — 1905.

На пачатку 1920-х гадоў тут працавала амбулаторыя ад яўрэйскага шпіталя. З лістапада 1944 г. – туберкулезны шпіталь і тубдіспансер. На 1961 г. — абласны “Кожвендиспансер” (у будынку было аддзяленне роддома, дзе рабілі аборты).

**Сацыялістычная № 42** — Год пабудовы — 1910.

У 1980-я гады І. Трусаў і рэстаўратар Уладзімір Кіслы ўратавалі ў гэтым будынку адну з самых прыгожых печак у Гродне з нямецкага фаянсу. Пазней яна ўпрыгожвала канцэртную залу музея Гісторыі рэлігіі. На 1928 г. тут, магчыма, працавала мясная лаўка Шаломы Еліна. На 1961 г. – пітомнік сабакаводаў УУС Гродзенскага аблвыканкама. У 1970 г. – абласная Рада “ДСО “Динамо”.

**Сацыялістычная № 44 — Дом Крэйцара.** Пабудаваны у пачатаку XX ст.

З другой паловы 1944 г. будынак займаў “Спиртотрест”. У складскіх памяшканнях на першым паверсе ў верасні 1950 г. была арганізавана піўная, якую пазней перанеслі на вул. Ажэшкі. У снежні 1950 г. у выніку “уплотнения” “Спиртотреста” на другім паверсе размесцілася дабраахвотнае спарціўнае таварыства “Калгаснік». Рашэннем гарвыканкама ў мае 1951 г. кантора была перасалена ў памяшканне тытунёва-фармацэўтычнага завода, а займаемыя ёю памяшканні былі перароблены пад жытло. У ліпені 1955 г. дзеля расшарэння піўной пад закусачную № 9 Гроднзенскага трэста сталовых і рэстаранаў, было передадзена памяшканне салянога склада “Военторга”. У 1959 г. тут адчынілася крама № 6 «Машприборы».

У мае 1966 г. абутковая крама, якая працавала ў будынку, была пераведзена на вул. Ажэшкі, а яе памяшканні былі перададзены пад “Сберегательную кассу 1-го разряда”. Акрамя таго, на пачатак 1970-х гг. у будынку працавалі сталярная майстэрня ад домаўпраўлення ды “Бюро реклам комбината благоустройства”.

## Т

**Тызенгаўза плошча // Городницкая площадь, Губернская площадь, Дворцовая площадь, Александровская, Napoleona, Wołnosci, York-Platz, плошча Леніна, площадь Тизенгауза** — *Сфармавалася ў 1765-1785 гг. па праектным плане архітэктараў І. Мёзера і Дж. Сака.*

*Пасля Другой Сусветнай вайны плошча стала насіць назву імя Леніна. Падчас рэканструкцыі плошчы Леніна быў знесены флігель Дома адміністратара з тым, каб «падчас святочных першамайскіх і кастрычніцкіх дэманстрацый забяспечыць свабодны праход калонам працоўных каля трыбунаў і помніка Леніну...». У 1992 годзе гістарычная частка плошчы Леніна рашэннем гарвыканкама па прапанове гарадской тапанімічнай камісіі была пераназвана ў плошчу Тызэнгаўза.*

*Гэтак, не захаваўся будынак пад № 2/1, пабудаваны, прыкладна ў сярэдзіны XI ст., які яшчэ ў часы Расійскай імперыі выконваў функцыю псіхіятрычнай лячэбніцы. На 1926 г. – псіхіятрычнае аддзяленне гарадскога шпіталя. У 1939-1940 гг. кінатэатр. У 1960-70-е г.г. тут знаходзіўся гарком КПБ і гарком ЛКСМБ. Рашэннем гарвыканкама ў кастрычніку 1969 г. быў адведзены зямельны ўчастак пад праеткаванне навага будынка гаркома партыі са сносам жылых дамоў па вул. 11-га ліпеня № 2, № 4. Пазней у былой псіхіятрычнай лячэбніцы знаходзіўся аддзел рэгуляцыі рэчываў АН БССР. Сам будынак быў знесены ужо ў 1986 г. пад час рэканструкцыі тагачаснай плошчы Леніна "для удобства прохождения колонн демонстрантов по площади".*

**Тэльмана**

**Тэльмана № 3 – Дом Карасіка**. Час пабудовы – каля 1901 г.

З 1944 г. тут пачала працаваць савецкае фотаатэлье. Тады ж тут з'явілася і крама № 3. На 1970 г. – абласная кантора "Стройбанка". У 1990-х гг. быў моцна перабудаваны пад патрэбы гродзенскай архітэктурнай арганізацыі, аднак пасля перайшоў да ўпраўлення КДБ па Гродзенскай вобласці.

**Тэльмана № 4 — Дом купца Фрумкіна на Іванаўскай, дом Лебедзева.** Год пабудовы — 1856.

Па стану на жнівень 1944 г. – Абласное ўпраўленне Народнага камісарыята юстыцыі. У 1950 г. – нарсуд 1-го участка г. Гродна і абласны суд. У 1982 г. тут працавала "Объединение парикмахерских и фоторабот «Зенит»".

**Тэльмана № 5 — Дом Лінкевіча, прэзідыўм гродзенскай калегіі адвакатаў.** Год пабудовы — 1900.

У жніўні 1944 г. у доме знаходзілася кантора гродзенскага "Облспецторга", якую выселілі 20 жніўня 1945 г., а памяшканні перадалі кілбаснай фабрыцы гродзенскага мясакамбіната.

**Тэльмана № 7 — Дом Карпава**. Год пабудовы — 1900.

У 1945 г. – вайсковая пракуратура гродзенскага гарнізона.

**Тэльмана № 9 — Дом Рымана, Ленінскі РАУС горада Гродна.** Год пабудовы— 1905.

Пад час нямецкай акупацыі тут месцілася гестапа. У міжваенны час у будынку знаходзілася Банкаўскае таварыства. У 1950 г. – абласны савет "ДСО «Динамо»". У 1960-70-я г.г. – УУС аблвыканкама. З 1969 па 2009 г.г. – адраснае бюро УУС.

**Тэльмана № 10 — Дом Клемпнера, яўрэйская малебная школа; сядзіба НКУС, КДБ.** Год пабудовы — 1905.

Будынак быў дабудаваны для патрэбаў карыстальніка – УКДБ па Гродзенскай вобласці.

# Дадатак

## 1. Фотаздымкі з выставы *“Паўстагоддзя савецкага Гродна вачыма аднаго гродзенца”*



1-1. Так выглядаў цэнтар Гродна ў 1946 годзе.



1-2. Першыя гарадскія аўтобусы на Савецкай вуліцы. 1952 г.


1-3. Стаянка таксі на плошчы Леніна. 1952 г.


1-4. Маладыя гродзенцы (Аляксандар Госцеў з сястрой). 1950-я гг.



1-5. Сланіха Машка, знакамітая жыхарка гродзенскага заапарка. 1962 г.




1-6. Святкаванне 20-ці годдзя Перамогі на стадыёне “Чырвонае Знамя”, 1965 г.



1-7. Новабудоўлі на вуліцах Пушкіна і Горкага, другая палова 1960-х гг.



1-8. Завяршаецца будаўніцтва гасцініцы “Беларусь”, 1968 г.




1-9. Гродзенец каля афішы кінатэатра, 1969 г.



1-10. Трыбуна на Савецкай плошчы. Ленін кажа ўсім “Прывітанне!”, або наадварот развітваецца з намі.

## 2. Фотаздымкі з інтэрактыўных сустрэч-экскурсій (восень 2010 г.)



2-1. Сустрэча-экскурсія “Верасень 1939 года. Нараджэнне савецкага Гродна”.



2-2. Удзельнікі праграмы.



2-3. В. Саяпін распавядае пра праявы савецкай ідэалогіі на вуліцах Гродна.



2-4. Сустрэча-экскурсія “Людзі ў форме”.

# Заўвагі

# Заўвагі

# ЗМЕСТ

Прадмова........................................................................................................ 3

**“**У пошуках гісторыі**“**: паўсядзённае жыццё савецкага Гродна................ 5

“Як вывучаць гісторыю савецкага Гродна?” (некалькі парад аматарам гісторыі)........................................................................................................ 6

Даведнік-пуцявод па вуліцах і будынках савецкага Гродна...................... 13

Дадатак........................................................................................................ 38

Метадычна-даведачнае выданне

Саяпін В., Вашкевіч А., Трусаў І., Чарнякевіч А.

**“У пошуках гісторыі”:**
**паўсядзённае жыццё савецкага Гродна**
дапаможнік

Надрукавана ў ТАА «ПРЫНТАУТ»

На правах унутранай дакументацыі

Наклад 60 асобнікаў